

АХВЯРЫ ГЕНАЦЫДУ Ў ЛУНІНЦЫ 8

КАПРАМОНТ: МЕТРЫ І РУБЛІ 7





Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

18 ЖНІЎНЯ 2021 г. СЕРАДА № 157 (29526)


ЦЫТАТА ДНЯ



**Аляксей АЎРАМЕНКА, міністр транспарту і камунікацый:**

*«Калі гаварыць пра будаўніцтва чыгункі да аэрапорта, то гэтае пытанне знаходзіцца ў стадыі праектавання. Мы рыхтуем адпаведныя разлікі. Нам патрэбны прыкладна два гады на праектаванне гэтага ўчастка чыгуначнага пуці. У першую чаргу — гэта дадатковыя пуці, якія будуць праектавацца да асноўнага. Будзе вырашана не толькі пытанне пуску электрычкі ў аэрапорт, але і павялічыцца прапускная здольнасць мінскага чыгуначнага вузла — транзітнага напрамку з захаду на ўсход. Гэта практычна палова ўсяго праекта будаўніцтва лініі непасрэдна да Нацыянальнага аэрапорта. Паралельна прапрацоўваем і крыніцы фінансавання. Будзем вызначацца зыходзячы з актуальных умоў на рынку».*

# Дзе мёд, там і свята!



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Сёлета, на першы Спас па-праваслаўным календары, а гэты дзень у народзе называюць «Макавеем» альбо «Мядовым Спасам», мне давялося быць сярод удзельнікаў багаслужэння ў адзіным у Беларусі казацкім храме.**

СТАР. 13

КОРАТКА

- **ВУП Беларусі ў студзені — ліпені вырас на 3,3 %.**
- Беларусы могуць атрымліваць егіпецкія электронныя візы. Кошт збору за разгляд візавай заяўкі залежыць ад кратнасці ўезду і складае для аднаразовага ўезду — $25, шматразовага — $60.
- **Кальцавую дарогу вакол Магілёва пабудуюць да чэрвеня 2023 года.**
- «Кушлянскі фэст» пройдзе 28 жніўня ў Музеі-сядзібе Францішка Багушэвіча.
- **Конкурсныя фільмы кінафестывалю «Лістапад» сёлета пакажуць у рэгіёнах.**
- Прэм'ер-міністры краін ЕАЭС сустрэнуцца ў вочным фармаце 19—20 жніўня ў Кыргызстане.

ISSN 1990 — 763X

Насустрач школе

## НА ПАРАДКУ ДНЯ — БЯСПЕКА

### Урачыстыя мерапрыемствы, прысвечаныя пачатку новага навучальнага года, пройдуць ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі Мінска і Мінскай вобласці 1 верасня

**У гэты ж дзень у сталіцы расчыняць свае дзверы для вучняў і дзве новыя школы. Адна з іх, разлічаная на 750 навучэнцаў, размясцілася ў мікрараёне Магістр: тут будуць навучацца як выхаванцы Нацыянальнага дзіцячага тэхнапарка, так і жыхары з прылеглай да ўстановы адукацыі тэрыторыі. А ў мікрараёне Лошыца-9 у строй уводзіцца школа з басейнам з праектнай магутнасцю 1020 чалавек.**

— Усяго ў новым навучальным годзе ў Мінску будуць функцыянаваць 245 школ і гімназій, — расказала **намеснік старшыні камітэта па адукацыі Мінгарвыканкама Ірына ЧАРНЯЎСКАЯ.** — Пасля капітальнага рамонту ўводзіцца пяць устаноў. У тым ліку пераедзе ў рэканструяваны будынак па вуліцы Цікоцкага кадэцкае вучылішча. Нарэшце, мы з радасцю прымем у наш строй гімназію № 25. Яна функцыянавала на базе іншых устаноў. Таксама пасля капітальнага рамонту вяртаюцца абноўленыя сярэднія школы №№ 167, 48 і 60, але закрываюцца на капітальны рамонт з адсяленнем вучняў гімназія № 4 і сярэднія школы №№ 104, 160 і 210.

У Мінску на правядзенне рамонтна-будаўнічых работ ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі з бюджэту горада накіравана 72 мільёны рублёў, у тым ліку на капітальны рамонт — 41,1 мільёна рублёў.

СТАР. 4

Будзьце здаровы!

## СУПЕРФУД НАШЫХ ШЫРОТ

### Чым унікальны рапсавы алей і за што яго цэняць дыетолагі

**Апошнім часам аб рапсавым алеі даводзіцца чуць усё часцей. Пачалося гэта гадоў пяць таму: дыетолагі і фуд-блогеры сталі актыўна спрачацца пра яго карысць ці шкоднасць, а многія гарадскія жыхары з ліку аматараў правільнага харчавання ўпэршыню даведаліся, што ёсць такая культура — рапс, з якой робяць алей. Сёння большасць дыетолагаў сыходзіцца ў меркаванні, што рапсавы алей — гэта суперфуд нашых шырот: каштоўная крыніца поліненасычаных тлустых кіслот, а значыць, залог здароўя сасудаў і маладосці скуры.**

СТАР. 11



З першых вуснаў

# «ПЕРААДОЛЕННЕ ШОКАВЫХ БАР'ЕРАЎ — НАЙПЕРШ КЛОПАТ ПРАЦОЎНЫХ КАЛЕКТЫВАЎ І КІРАЎНІКОЎ ГЭТЫХ КАЛЕКТЫВАЎ»

**На нарадзе з кіраўніцтвам Савета Міністраў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка абмеркаваў эканоміку, нацыянальную бяспеку, перагаворы з Расіяй па інтэграцыйных праграмах і карэкціроўку некаторых паўнамоцтваў урада.**

«Сёння мы павінны аператыўна разгледзець чатыры тэмы. Гэта, перадусім, нашы праграмы ў рамках Саюза Беларусі і Расіі. Пра гэта шмат ужо сказана. Мы гаварылі пра гэта на Усебеларускім народным сходзе, і падчас правядзення «Вялікай размовы» таксама падымаліся гэтыя праблемы», — сказаў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што зразумела, на якім узроўні знаходзяцца саюзныя дакументы. Больш цікавіць: калі рэалізуюцца і фармалізуюцца гэтыя праграмы.

Другая тэма сустрэчы Прэзідэнта з Саўмінам — праект закона «Аб урэгуляванні неплацежаздольнасці», які распрацоўваўся на ўзроўні кіраўніка дзяржавы каля года таму.

«Тады мы прынцыпова дамовіліся па падыходах. Ураду было даручана змяніць ідэалогію гэтага праекта — сысці ад банкруцтва да рэабілітацыі праблемных прадпрыемстваў, а таксама пабудаваць яго на іншай канцэпцыі — абароне арганізацый ад шокаў, выкліканых неспрыяльнымі знешнімі фактарамі. Пры гэтым хачу сказаць, што пераадоленне гэтых шокавых бар'ераў — найперш клопат працоўных калектываў і кіраўнікоў гэтых працоўных калектываў», — дадаў Прэзідэнт.

Па інфармацыі кіраўніка краіны, дадзенае патрабаванне выканана, і прадугледжана, што будзе адбывацца адыход ад судовага суправаджэння ўсіх этапаў разгляду спраў аб эканамічнай неплацежаздольнасці.

«Нагадаю, спасылаючыся на вопыт Савецкага Саюза, мною было даручана не перагружаць суды неўласцівымі для іх пытаннямі. Таму што завалілі суды рознага кшталту праблемамі эканамічнага характару, спрэчнымі пытаннямі, звязанымі з эканомікай. Раней гэтыя пытанні вырашаліся — складана, проста, няпроста — але ў мясцовых органах улады», — сказаў Прэзідэнт.

Па яго словах, каардынуючая роля ў пытаннях фінансавага аздараўлення — канчаткова засяроджана ва ўрадзе, галіновых органах і выканкамах. Кіраўнік краіны не выключае, што некаторыя пытанні прыйдзецца вырашаць і праз суды — але як у апошняй інстанцыі.

Наступнае пытанне нарады датычылася тэмы забеспячэння грамадскай бяспекі.

«Гэта першапачатковая функцыя любой дзяржавы. Асабліва па выніках мінулага года мы добра разумеем сёння, што такое грамадская бяспека і на чым яна заснавана. Нам неабходна працаваць на перспектыву, у тым ліку з выкарыстаннем сучасных тэхнічных прылад, узровень якіх павінен адпавядаць патрабаванням, якія прад'яўляюцца і абстаноўцы, што складваецца», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Ён працягнуў, што Беларусь у гэтым плане вельмі адстала ад вядучых краін свету і давядзецца іх даганяць.

Таксама Прэзідэнту прадстаўлены праект указа, які прадугледжвае змены падыходаў у сістэме маніторынгу грамадскай бяспекі.

«Прашу далажыць, якія новыя падыходы павысяць грамадскую бяспеку? Якая нагрузка ў цэлым ляжа на бюджэт? Пры гэтым прашу мецъ на ўвазе, што мы не можам сабе дазволіць неэфектыўнае выкарыстанне бюджэтных сродкаў. І функцыі, і метады кантролю павінны быць пад'ёмныя для беларускай дзяржавы. Ніякіх празмернасцяў быць не павінна. Я ніколі на гэта не пайду», — канстатуе Прэзідэнт.

Акрамя таго, Аляксандр Лукашэнка лічыць, што неабходна дасканала прапрацаваць пытанне абароны інфармацыі, прыняць усе меры для недапушчэння ўразлівасці сістэмы.

«Вельмі актуальна. Калі не можаце, як я часта кажу, абараніць інфармацыю ў сваіх камп'ютарах, тады вяртайцеся да папяровых носьбітаў. Пішыце ад рукі і складвайце ў сваіх скрынях», — мяркуе кіраўнік краіны.

Паводле яго слоў, адначасова праваахоўным органам неабходна актывізаваць дзейнасць па папярэджанні злачынстваў у сферы высокіх тэхналогій.

«Праблема архіважная. Ужо і бабулі, і дзядулі сёння перайшлі на «лічбу» пры захаванні і расходаванні сваіх грашовых сродкаў. Прытым, часам не думаюць, у чые рукі трапляе гэтая «лічба» і што з ёй зробяць», — акцэнтаваў кіраўнік краіны.

Яшчэ адным пытаннем для абмеркавання стала карэкціроўка некаторых паўнамоцтваў урада як працяг работы па пераразмеркаванні функцый паміж органамі дзяржаўнай улады.

«Прапанавана выключыць неабходнасць вызначэння ўрадам пазіцыі для прадстаўнікоў дзяржавы пры адчужэнні буйных аб'ектаў нерухомасці. Абмяркуем гэтае пытанне: трэба нам, не трэба, надуманае гэта пытанне ці жыць не зможам без яго. І хацелася б пачуць, да чаго прывядуць такія навацыі і ці не страціць дзяржава ў гэтым выпадку кантроль за продажам прыцягальных актываў», — сказаў Прэзідэнт. Ён рэзюмаваў, што падыход павінен быць адзін: актуальна гэта сёння ці не.

**Марыя ДАДАЛКА.**

**З адпаведным дакладам выступіў першы віцэ-прэм'ер Мікалай СНАПКОЎ, які ўзначальвае перагаворы з Расіяй па саюзных праграмах.**

**«Ужо амаль тры гады па ініцыятыве нашых расійскіх партнёраў мы рэалізоўваем падыходы па паглыбленні інтэграцыі ў рамках выканання дагавора аб стварэнні Саюзнай дзяржавы. Пасля замарозкі гэтай тэматыкі зімой 2019 года перагаворы былі адноўлены летам 2020-га. У працэсе перагавораў даволі хутка выявілася ядро інтарэсаў з кожнага боку. Для расіян гэта пытанні падатковага і мытнага рэгулявання, інакш кажучы, празрыстасці, прасочвальнасці тавараў па іх тэрыторыі. Для нас — умовы супрацоўніцтва ў энергетыцы і доступ на расійскі рынак. Ва ўсім пакеце эканамічных інтэграцыйных дамоўленасцяў галоўная складанасць у нашых перагаворных пытаннях выявілася ва ўзаемаўвязванні гэтых сустрэчных інтарэсаў», — лічыць Мікалай Снапкоў.**

**Паводле яго слоў, у выніку бакі выйшлі на практычна цалкам узгодненны пакет інтэграцыйных дакументаў, які ўключае асноўныя напрамкі і 28 галіновых саюзных праграм, а таксама праекты рашэнняў саюзнага Саўміна і Вышэйшага дзяржсавета Саюзнай дзяржавы аб іх адабрэнні.**

## Каментарый у тэму

Праект закона «Аб урэгуляванні неплацежаздольнасці» дастаткова складаны, таму што закранае інтарэсы канкрэтных прадпрыемстваў, а пытанні неплацежаздольнасці актуальныя і адчувальныя. На гэта звярнуў увагу журналістаў **міністр эканомікі Аляксандр ЧАРВЯКОЎ.** Па яго словах, кіраўнік краіны абазначыў, што ў праекце дакумента павінна быць узмоцнена роля мясцовых органаў улады пры прыняцці рашэнняў па аздараўленні праблемных кампаній.

«Галоўная задача — не допускаць сітуацый, калі прадпрыемства будзе пераходзіць у працэдуру судовых разбораў, галоўны акцэнт трэба зрабіць на дасудовае аздараўленне, прыняцце мер, каб канкрэтныя прадпрыемствы не пераходзілі ў працэдуру банкруцтва, а прымаліся меры на ўзроўні органаў мясцовых улад», — расказаў падрабязнасці міністр.

Ён дадаў, што ў кароткія тэрміны закон «Аб урэгуляванні неплацежаздольнасці» неабходна дапрацаваць з узмацненнем ролі мясцовай улады. Увогуле, па даручэнні Прэзідэнта, закон павінен быць прыняты сёлета і пачаць працаваць з 1 студзеня 2022 года.

Асноўная мэта ўласнікаў, органаў дзяржаўнага кіравання — працаваць на папярэджанне, каб прадпрыемствы не станавіліся банкрутамі, дадае Аляксандр Чарвякоў.

«Усе ўласнікі павінны кантраляваць, маніторыць сітуацыю, а калі сітуацыя пагаршаецца, прымаць адпаведныя меры, планы па аздараўленні, не даводзіць прадпрыемства да суда», — сцвярджае Аляксандр Чарвякоў.

Пры гэтым, як ён абазначыў, у кожным выпадку прымаюцца свае механізмы аздараўлення. Прадпрыемствы падаюць у крызісную сітуацыю з розных прычын. «Дзесьці неабходна вырашаць пытанні падаткаў, дзесьці — крэдытнай нагрузкі, дзесьці — з кадрамі. У кожным выпадку неабходны свой план фінансавага аздараўлення», — кажа Аляксандр Чарвякоў.

Па яго словах, у працэдурах аздараўлення сёння знаходзіцца каля 1600 прадпрыемстваў, і толькі 150 з іх адносяцца да дзяржаўнага сектара.

Адказваючы на пытанні пра ўплыў санкцый і пандэміі на бізнес, міністр адзначыў, што гэтыя фактары маюць вагу, але ўрад не пакідае задачы іх мінімізаваць.

**Генадзь КАЗАКЕВІЧ, намеснік міністра ўнутраных спраў, начальнік крымінальнай міліцыі** пракаментаваў, якія змены па праекце новага ўказа чакаюць сістэму маніторынгу грамадскай бяспекі.

Па яго словах, з 2017 года адзначаюцца нізкія тэмпы развіцця гэтай сістэмы, функцыянал якой не ў поўнай меры адпавядае патрабаванням праваахоўнікаў. Пакуль вымушаюць жадаць лепшага колькасць падключаных аб'ектаў да рэспубліканскай сістэмы маніторынгу грамадскай бяспекі, інтэлектуальныя здольнасці сістэмы.

«Правёўшы аналіз, мы вызначылі канкрэтныя прычыны неналежнага стану спраў, і ў новым праекце ўказа, які вынеслі на разгляд кіраўніку краіны, прапанавалі новую канцэпцыю развіцця сістэм. Мы прапанавалі, каб адзіным аператарам, суб'ектам гаспадарання, які будзе адказны за праектаванне, пракладку ліній сувязі, устаноўку, зборку і аналіз відэапатоку, было прадпрыемства «Белтэлекам», — паведаміў намеснік міністра.

Ён дадаў, што Прэзідэнт паставіў дакладныя задачы для дэталёвага вывучэння фінансавання праекта. Мяркуецца, грошы ў работу рэспубліканскай сістэмы маніторынгу грамадскай бяспекі ўкладзе не толькі «бюджэт». Праект стане прыкладам дзяржаўна-прыватнага партнёрства.

Распрацавана ў будучым указе і структура аб'ектаў, якія неабходна ўзяць пад нагляд. «Прапанавана ўсе аб'екты разбіць на чатыры катэгорыі па ступені значнасці для праваахоўнікаў і паступава падключаць іх да дзеючай сістэмы», — расказаў Генадзь Казакевіч.

У праекце ўказа прадугледжана, што сістэма будзе закрытая, а распрацоўшчыкам праграмнага забеспячэння стане нацыянальная IT-кампанія. Гэта павінна папярэдзіць рызыку кібератак.

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Амерыканцы негатыўна ацанілі заяву Байдэна па Афганістане

Чытачы The Washington Post крытычна ацанілі заяву прэзідэнта ЗША Джо Байдэна аб тым, што ён не шкадуе аб вывадзе войскаў з Афганістана. Яны назвалі аперацыю правальнай і запатрабавалі вярнуць выдаткаваныя на яе грошы падаткаплацельшчыкаў.

«Пяцьсот трыльёнаў долараў, 75 гадоў і ніводнай перамогі ў сур'ёзных ваенных канфліктах. Мы маглі б выкараніць беднасць, уклaсціся ў адукацыю, пакрыць выдаткі на ахову здароўя, развіваць мастацтва, даць прытулак бяздомным і зрабіць шмат чаго іншага, выкарыстоўваючы толькі малую частку гэтых грошай. Куды дзеліся ўсе гэтыя сродкі? Яны дасталіся багатым інвестарам і начальнікам. Наш урад літаральна фінансуе багацеяў», — абурыўся карыстальнік з нікам Are Trumps Taxes Still Under Audit.

«Афганістан аказаўся нам не па зубах. Наступным разам нам варта нацэліцца на якое-небудзь месца накшталт Сен-Мартэна (*невялікі востраў у Карыбскім моры. — **Заўв. Рэд.***)», — іранізуе sic sember Trumpis.

«Злучаным Штатам спатрэбіліся чатыры прэзідэнты, тысячы жыццяў, трыльёны долараў і 20 гадоў, каб замяніць «Талібан» на... «Талібан», — падсумавалі чытачы.

Напярэдадні прэзідэнт, выступаючы з прамовай па Афганістане, заявіў, што Злучаным Штатам важна было прадухіліць тэрарыстычную атаку ў свой бок — і гэтая мэта дасягнута. Ён таксама адзначыў, што засмучаны падзеямі ў Ісламскай Рэспубліцы, але не адчувае шкадавання з нагоды рашэння вывесці войскі.

### Галоўная памылка Украіны з моманту развалу СССР

Былы прэзідэнт Украіны Віктар Януковіч назваў адмову ад добрасуседства з Расіяй галоўнай памылкай краіны за 30 гадоў незалежнага існавання. Пра гэта ён заявіў падчас звароту да ўкраінскага народа з нагоды 30-годдзя незалежнасці краіны з моманту развалу СССР, паведамляе РІА Навіны.

На яго думку, гэты неабдуманы крок кіраўніцтва прывёў да расколу ўсяго ўкраінскага грамадства, росту нацыяналістычных настрояў і праследавання апазіцыйных палітыкаў, якія выступаюць за аднаўленне сувязяў з Расіяй. Паступовае аддаленне ад Расіі таксама спарадзіла глыбокі эканамічны крызіс і сацыяльную нестабільнасць.

Ён дадаў, што за ўсе гады Украіна так і не набыла статус незалежнай дзяржавы і яе знешнепалітычнае становішча на сусветнай арэне цалкам залежыць ад амерыкана-расійскіх адносін, якія вызначаюцца сваёй нестабільнасцю.

### Іл-112В, які разбіўся ў Падмаскоўі, пілатаваў Герой Расіі



Камандзірам экіпажа доследнага ўзору найноўшага расійскага ваенна-транспартнага самалёта Іл-112В, які ўчора разбіўся ў Падмаскоўі, быў лётчык-выпрабавальнік, Герой Расіі Мікалай Куімаў, паведамляе ТАСС са спасылкай на прэс-службу Аб'яднанай авіябудаўнічай карпарацыі.

Іл-112В разбіўся падчас трэніровачнага палёту каля падмаскоўнага аэрадрома Кубінка. На борце самалёта знаходзіліся тры члены экіпажа. Прычыны таго, што здарылася, высвятляюцца.

Год народнага адзінства

# З ВЕРАЙ І ПРАЎДАЙ

**Падпісана прагpама супрацоўніцтва Брэсцкага аблвыканкама з Брэсцкай і Пінскай епархіямі Беларускай праваслаўнай царквы на найбліжэйшую пяцігодку.**



Фота Валерыя КАРАЛЯ.

Пасля падпісання дакумента **старшыня Брэсцкага аблвыканкама Юрый ШУЛЕЙКА** ў размове з журналістамі акцэнтаваў увагу на неабходнасці кансалідацыі нашага грамадства, усталяванні ўсеагульнага міру і спакою. У гэтай справе, паводле меркавання кіраўніка вобласці, многае залежыць ад святароў. Да іх прыходзяць людзі па параду, па адказы на надзённыя пытанні. Важна, каб свяшчэннікі клапаціліся пра спакой у душах сваіх прыхаджан, што і паспрые паляпшэнню агульнай атмасферы ў грамадстве.

Праграму аб супрацоўніцтве разам з губернатарам вобласці падпісалі кіраўнік Брэсцкай епархіі архіепіскап Брэсцкі і Кобрынскі Іаан і кіраўнік Пінскай епархіі архіепіскап Пінскі і Лунінецкі Сцяфан. Гэты грунтоўны дакумент з 10 раздзелаў накіраваны на аб'яднанне намаганняў органаў мясцовага кіравання вобласці і рэлігійных арганізацый Беларускай праваслаўнай царквы для ўмацавання духоўна-маральных асноў асобы і грамадства, стварэнне спрыяльных умоў для вырашэння сацыяльных задач рэгіёна.

Асаблівы ўпор зроблены на клопат пра выхаванне высокай духоўнасці і грамадзянскай адказнасці жыхароў вобласці, стварэнне ўмоў для ўмацавання інстытута сям'і, мацярынства, бацькоўства, дзяцінства, а таксама выкарыстанне велізарнага патэнцыялу праваслаўных духоўных і культурных традыцый у разнастайных сферах грамадскай дзейнасці. Менавіта таму першы раздзел прысвяцілі культуры і творчай дзейнасці, ахове, аднаўленню і развіццю гістарычнай і культурнай спадчыны. Прадугледжана папаўненне бібліятэк духоўнай літаратурай, удзел святароў у цэлым шэрагу свецкіх мерапрыемстваў. Таксама запланавана правядзенне фестывалю праваслаўных песнапенняў «Спявайце Богу нашаму, спявайце» ў Драгічыне.

Вельмі важна, што праграма супрацоўніцтва прадугледжвае не толькі вялікія акцыі і мерапрыемствы, але і наведванні ў маленькую сельскую школу, сустрэчы ў бібліятэках, грамадскіх арганізацыях, калектывах.

Вялікі раздзел праграмы адведзены рабоце з інвалідамі, няпоўнымі сем'ямі, сацыяльна неабароненымі слаямі грамадства, дзецьмі-сіротамі. У той частцы, якая прысвячаецца адукацыі і выхаванню, плануюцца мерапрыемствы па папярэджанні алкагалізму, наркаманіі, інтэрнэт-залежнасці, прафілактыцы суіцыдаў, правапарушэнняў сярод дзяцей і падлеткаў, прафілактыцы ранняга мацярынства, сацыяльнага сіроцтва. Прыходы будуць займацца арганізацыяй валанцёрскай дзейнасці, накіраванай на падтрымку сем'яў, якія маюць у гэтым патрэбу.

Разам з органамі мясцовай улады епархіі бяруцца распрацоўваць і выдаваць інфармацыйна-адукацыйныя матэрыялы па пытаннях здаровага спосабу жыцця, маральнага выхавання, фізічнага і псіхічнага здароўя насельніцтва, прафілактыцы залежнасцяў і розных інфекцый.

Асобныя раздзелы прадугледжваюць работу святароў ва ўстановах аховы здароўя, у вайсковых часцях, у месцах пазбаўлення волі. Уся сумесная работа накіравана на ўмацаванне духоўна-маральных асноў грамадства.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

# БЯЖЫМ РАЗАМ!

## Падрыхтоўка да Мінскага паўмарафону выйшла на фінішную прамую

**«Я рады, што доўгачаканы Мінскі паўмарафон адбудзецца. Гэта ўжо шосты Мінскі паўмарафон, які мы бяжым усе разам. Свята для аматараў бегу не адбылося б, калі б не сумесная работа Міністэрства спорту і турызму, Мінскага гарвыканкама і нашых спонсараў і партнёраў», — падкрэсліў Іван ЦІХАН, старшыня Беларускай федэрацыі лёгкай атлетыкі, на прэс-канферэнцыі, прысвечанай Мінскаму паўмарафону.**

Забег на 21, 10 і 5 кіламетраў у самым сэрцы беларускай сталіцы пройдзе 12 верасня. Старт галоўнай дыстанцыі ў 21 км будзе дадзены ў 9 гадзін раніцы, а на дыстанцыі 10 і 5 км — у 11.45. Летась Мінскі паўмарафон быў перанесены з-за эпідэмічных прычын. Але, як падкрэслілі арганізатары, усе слоты, зарэгістрававаныя ў мінулым годзе, захоўваюцца. Сёлета Мінскі паўмарафон мае ліміт удзельнікаў — па тры тысячы на дыстанцыі 21 і 10 км і чатыры тысячы на 5 км. Іван Ціхан падкрэсліў, што рэгістрацыя падыходзіць да верхняй планкі ліміту, і папрасіў усіх аматараў бегу як мага хутчэй пакінуць сваю заяўку. Таксама, ён падкрэсліў, што для школьнікаў, студэнтаў, пенсіянераў, ліквідатараў аварыі на Чарнобыльскай АЭС і інвалідаў рэгістрацыя на дыстанцыю 5 км без чыпа бясплатная.



Фота Аліны МАЗАВЕЦ.

Мінскі паўмарафон займаў рэпутацыю не проста забегу, а сапраўднага свята. Як падкрэсліў **Максім ВАРАПАЙ, начальнік галоўнага ўпраўлення спорту і турызму Мінскага гарвыканкама,** паўмарафон уключаны ў праграму святкавання Дня горада Мінска. «Ініцыятыва Мінска знайшла працяг у рэгіёнах краіны. Сталі традыцыйнымі Аршанскі паўмарафон, сёлета праходзіў Брэсцкі начны паўмарафон. Набіраюць папулярнасць трэйл-забегі па ўсёй краіне на працягу года», — адзначыў **Руслан ВАРАНКОЎ, начальнік галоўнага ўпраўлення планавання і арганізацыйнай работы Міністэрства спорту і турызму Рэспублікі Беларусь.**

Генеральны сакратар Беларускай федэрацыі лёгкай атлетыкі, каардынатар Мінскага паўмарафона Вераніка Грэсь расказала, якія новаўвядзенні будуць сёлета. Арганізатары падрыхтавалі спецыяльны Race-book, дзе змешчана ўся неабходная для ўдзельнікаў інфармацыя — даныя аб выдачы стартавых пакетаў, пунктах харчавання, асаблівасцях трасы і іншае. Натхняць удзельнікаў паўмарафону будзе яго талісман — заяц Дзярзайка, адзеты ў колеры сёлетняга паўмарафону.

Вераніка Грэсь прадставіла медалі Мінскага паўмарафону—2020. Штогод медалі падобныя, але кожны раз дызайнеры прыўносяць нешта асаблівае. Гэты год — не выключэнне. Медаль за пераадоленне кожнай дыстанцыі вылучаецца сваім колерам і колерам стужкі. Узнагарода за 21 км — чырвоная, за 10 км — сіняя і за 5 км — жоўтая. Упершыню ў гісторыі прабегчы Мінскі паўмарафон можна будзе ў рэжыме анлайн. «Гэта практыка забегаў ва ўсім свеце. Можна асобна зарэгістравацца ў анлайн-забег, прабегчы сваю дыстанцыю ў любы зручны час і прадаставіць пацвярджэнне. А мы па пошце даставім медаль у любы пункт свету. Акрамя таго, можна зарэгістравацца на адну дыстанцыю ў фармаце афлайн і на дзве — у анлайн. І такім чынам сабраць поўную калекцыю медалёў Мінскага паўмарафону», — расказала Вераніка Грэсь.

**Мінскі паўмарафон вылучаецца і сваім салідным прызавым фондам — 60 тысяч долараў у беларускім эквіваленце. Традыцыйна на забег у Мінск запрашаюцца элітныя бегуны з усяго свету. Сёлета, арганізатары робяць акцэнт на беларускіх спартсменаў. Ужо пацвердзіла свой удзел Ніна Савіна — член нацыянальнай зборнай па лёгкай атлетыцы, пераможца Кубка Еўропы ў бегу на 10 000 метраў, пераможца Мінскага паўмарафону 2019 года. У 2019 годзе яна ўстанавіла рэкорд трасы, прабегла 21 км за 1 гадзіну 11 хвілін і 24 секунды. На старт паўмарафону выйдуць і іншыя прафесійныя бегуны — Марына Даманцэвіч, Вольга Немагай, Сяргей Платонаў, Кацярына Карняенка.**

Асобна арганізатары звяртаюць увагу на супрацькаранавірусныя меры. Усім удзельнікам паўмарафону рэкамендуецца выконваць масачны рэжым, сацыяльную дыстанцыю. Абавязковы для ўсіх тэрмакантроль. Стартаваць таксама лепш у масцы, а калі дыстанцыя паміж бегунамі павялічыцца, можна яе зняць.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

Меркаванне

**Ала СМАЛЯК:**

# ЗРАБІЦЬ ВЫБАР НА КАРЫСЦЬ ЗДАРОЎЯ

## У Гомельскай вобласці для пажылых людзей і інвалідаў, якія пражываюць у аддаленых вёсках, плануецца арганізаваць падвоз да пунктаў вакцынацыі

**Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці, старшыня Гомельскай абласной арганізацыі Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа Ала СМАЛЯК лічыць, што неабходна актыўна інфармаваць насельніцтва пра важнасць вакцынацыі ад COVID-19.**



Акцэнт на гэтым сенатар зрабіла ў гутарцы з журналістамі, каменціруючы інфармацыйную кампанію Чырвонага Крыжа па вакцынацыі, што стартавала на Гомельшчыне. Сенатар звярнула ўвагу, што падчас акцыі ў месцах, дзе працуюць прышчэпачныя пункты, валанцёры раздаюць улёткі з адрасамі і рэжымам работы такіх пунктаў, пры неабходнасці суправаджаюць жадаючых да месца вакцынацыі, таксама ўручаюць улёткі з адказамі на самыя распаўсюджаныя пытанні аб імунізацыі.

— Цяпер важная шырокая інфармацыйная работа. Трэба тлумачыць, што зрабіць прышчэпку ад COVID-19 — значыць зрабіць выбар на карысць здароўя і засцярогі родных, блізкіх, навакольных. Чым больш людзей прышчэпіцца, тым хутчэй створыцца калектыўны імунітэт, — нагадала Ала Смаляк. Яна адзначыла важную ролю ў гэтым пытанні і мабільных пунктаў імунізацыі.

— Некаторыя людзі праз рабочы графік не заўсёды маюць магчымасць прыйсці на вакцынацыю ў паліклініку. У мабільныя пункты можна трапіць, напрыклад, у абедзенны час і атрымаць прышчэпку, — падкрэсліла Ала Смаляк.

Парламентарый таксама распавяла, што ў Гомельскай вобласці для пажылых людзей і інвалідаў, якія пражываюць у аддаленых вёсках, плануецца арганізаваць падвоз да пунктаў вакцынацыі.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**

Стыхія

# На Ждановіцкім рынку ў час непагадзі абрынуўся навес

**Учора ў выніку непагадзі адбылося частковае абвальванне навесу вулічнага гандлёвага рада на тэрыторыі ГД «Ждановічы» па вуліцы Ціміразева ў Мінску на плошчы 80 кв. м, паведамілі ў Следчым камітэце. Па папярэдніх даных, у выніку падзення навеса траўміраваны два чалавекі — жанчына і непаўналетняя дзяўчынка. Пацярпелыя шпіталізаваны.**



Следчыя працавалі на месцы здарэння сумесна з супрацоўнікамі МНС, ДКСЭ і міліцыі. Быў праведзены агляд, апытаны відавочцы здарэння, уладальнікі гандлёвых пунктаў і прадстаўнікі адміністрацыі гандлёвага дома.

Цэнтральным (горада Мінска) раённым аддзелам Следчага камітэта па гэтым факце праводзіцца праверка.

# НА ПАРАДКУ ДНЯ — БЯСПЕКА



*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар.)*

Асноўны аб'ём сродкаў быў накіраваны на мадэрнізацыю харчблокаў, для якіх закуплена 348 адзінак абсталявання на суму больш як 920 тысяч рублёў. Таксама выкананыя сур'ёзныя работы па мадэрнізацыі аўтаматычнай пажарнай сістэмы бяспекі (на гэтыя мэты выдаткавана 209 тысяч рублёў). На рамонт фасадаў, ганкаў, жылых блокаў накіравана 17 тысяч рублёў.

Сертыфікаты гатоўнасці да новага навучальнага года атрымалі ўжо практычна ўсе сталічныя ўстановы адукацыі. Вызначаны загадам Міністэрства адукацыі канчатковы тэрмін гатоўнасці — 20 жніўня, але Мінск традыцыйна ідзе з апярэджаннем.

Што датычыцца недзяржаўных устаноў агульнай сярэдняй адукацыі, то на канец мінулага навучальнага года ў Мінску іх налічвалася 19. «Не выключана, што да 1 верасня колькасць устаноў прыватнай формы ўласнасці павялічыцца, — заўважыла Ірына Чарняўская. — Мы вельмі сур'ёзна з імі працуем, запрашаем спецыялістаў камітэта па адукацыі, МНС і санстанцыі, Мінскага гарадскога інстытута развіцця адукацыі. З імі дзеляцца вопытам найлепшыя кіраўнікі горада. Важна, каб усе ўстановы адукацыі, у тым ліку прыватныя, дзейнічалі ў рамках нарматыўнага заканадаўства». Ірына Чарняўская падкрэсліла, што горад зацікаўлены ў з'яўленні прыватных устаноў, якія на належным узроўні ўдзельнічаюць у адукацыі дзяцей.

Намеснік старшыні камітэта па адукацыі праінфармавала, што ў 15 установах агульнай сярэдняй адукацыі Мінска вучні займаюцца на беларускай мове. У пяці гімназіях увесь працэс навучання цалкам арганізаваны на беларускай мове. І ў дзесяці сярэдніх школах такое навучанне арганізавана ў асобных класах (171 клас, у якіх навучаюцца каля чатырох тысяч дзяцей).

Што датычыцца сітуацыі з педагагічнымі кадрамі ў Мінску, то вакантнай застаецца 1681 пасада з больш як 33 тысяч. Па-ранейшаму не хапае выхавальнікаў у дашкольных установах і настаўнікаў пачатковых класаў у школах. Але калі аналізаваць больш падрабязна, то ў сярэднім на 486 устаноў дашкольнай адукацыі прыпадае толькі адна вакансія выхавальніка, і яна закрываецца за кошт павелічэння нагрузкі на іншых педработнікаў.

У сталіцы сёння робіцца стаўка на адкрыццё педагагічных класаў і павелічэнне набору ў гарадскі педагагічны каледж, дзе менавіта і рыхтуюць кадры для дашкольных устаноў і пачатковай школы. У новым навучальным годзе колькасць педагагічных класаў павялічыцца на 12 — такім чынам, іх стане 35. Гэта самыя матываваныя абітурыенты педагагічных спецыяльнасцяў.

Пэўнай праблемай для сталічнай сістэмы адукацыі застаецца даволі высокі працэнт педагогаў пенсійнага ўзросту. Іх цяпер налічваецца 24 працэнты ад агульнай колькасці.

— Не хацелася б пакрыўдзіць нашых масцітых педагогаў, але новае пакаленне патрабуе сучасных форм зносінаў, валодання інфармацыйнымі тэхналогіямі і сучаснымі ведамі, — дадала Ірына Чарняўская. — Што датычыцца замацавальнасці маладых спецыялістаў, то часцей за ўсё пасля адпрацоўкі па размеркаванні са школ сыходзяць маладыя настаўнікі англійскай мовы і матэматыкі. Астатнія ж педагогі замацоўваюцца ў школах — для гэтага робіцца шмат захадаў у супрацоўніцтве з прафсаюзнымі арганізацыямі.

Сёння ва ўстановах адукацыі Мінска завяршаецца ўстаноўка сістэм бяспекі і відэаназірання — дадатковых камер і турнікетаў на ўваходах. Па стане на 16 жніўня турнікеты ўжо ўсталяваны ў 85 % школ. Дагаворы з Дэпартаментам аховы заключаны практычна ўсюды. У 82 % школ устаноўлены камеры відэаназірання. «Такім чынам, у найбліжэйшы час гэтая работа будзе завершана, — сказала Ірына Чарняўская. — На ўстаноўку дадатковых відэакамер, а таксама заключэнне дагавораў з Дэпартаментам аховы грошы былі выдзелены з бюджэту горада. А вось закупка турнікетаў вялася за кошт пазабюджэтных сродкаў, для гэтага прыцягваліся спонсары, арганізацыі-шэфы школ, дзяржаўныя прадпрыемствы і прыватныя кампаніі. Дадатковыя відэакамеры накіраваны на ўваход з мэтай падключэння іх у далейшым да гарадской і рэспубліканскай сістэм відэаназірання».

«Новыя сістэмы бяспекі не стануць перашкодай для бацькоў і іншых людзей, якія хочуць, напрыклад, прыйсці ў школу для гутаркі з адміністрацыяй або настаўнікам. Але пры прапускным рэжыме трэба будзе папярэдне запісацца ці агаварыць час наведвання», — патлумачыла Ірына Чарняўская.

Таксама сёння яшчэ не завяршылася работа па падборы кадраў на новую пасаду — кіраўніка па ваенна-патрыятычным выхаванні, што з'явіцца ва ўстановах адукацыі з 1 верасня.

«Складзеныя штатныя расклады, стаўкі ўведзены ў залежнасці ад колькасці вучняў у школах. Гэта можа быць палова стаўкі ці стаўка, — патлумачыла **першы намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення па адукацыі Мінаблвыканкама Соф'я ФІЛІСТОВІЧ.** — Кандыдатуры на гэтую пасаду прапрацоўваюцца кіраўнікамі ўстаноў адукацыі сумесна з мясцовымі ваенкамамі і прадстаўнікамі МУС. У першую чаргу, разглядаюцца ваенныя з педагагічнай адукацыяй. Гэта павінен быць не проста спецыяліст, які будзе праводзіць урокі дапрызыўнай падрыхтоўкі, а асоба з актыўнай грамадзянскай пазіцыяй. У яго задачы таксама будзе ўваходзіць арганізацыя патрыятычнага выхавання моладзі, прыцягненне дзяцей да ўдзелу ў акцыях, конкурсах і спаборніцтвах не проста для птушачкі, а каб яны змаглі атрымаць задавальненне ад падобных мерапрыемстваў і пасля ўжо самастойна праяўляць ініцыятыву для ўдзелу ў іх. Нам сёння патрэбныя новыя формы і метады работы з моладдзю...»

Дакладная колькасць кіраўнікоў па ваенна-патрыятычным выхаванні, якія пачнуць работу ў Мінскай вобласці, пакуль невядома. Падбор такіх спецыялістаў сёння праводзіцца таксама і ў Мінску.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Ведай нашых!

# ВЫШЭЙШЫ ПІЛАТАЖ У ГЕАГРАФІІ

**Выпускнік Брэсцкай гімназіі № 1 Дзяніс Рабчук заваяваў залаты медаль на XVII Міжнароднай алімпіядзе па геаграфіі (iGeo-2021). Гэта ўжо другое «золата» на рахунку беларускіх школьнікаў у гісторыі ўдзелу нацыянальнай зборнай у iGeo.**



Фота «Вечерний Брест».

Таксама нашу краіну на алімпіядзе прадставілі Ілья Туча (гімназія № 1 г. Баранавічы), Леанід Палхоўскі (Магілёўскі дзяржаўны абласны ліцэй № 3) і Дзмітрый Міхасько (гімназія № 2 г. Віцебска). Удзел юных географаў у міжнародным спаборніцтве стаў магчымым дзякуючы іх паспяховаму выступленню сёлета на Еўрапейскай міжнароднай алімпіядзе па геаграфіі, дзе яны заваявалі два сярэбраныя і шэсць бронзавых медалёў.

Кіраўнікамі каманды выступілі дэкан факультэта геаграфіі і геаінфарматыкі БДУ Дзмітрый Курловіч і дацэнт кафедры эканамічнай і сацыяльнай геаграфіі гэтага факультэта Ілья Запрудскі.

Удзельнікам прапаноўвалася вырашыць мультымедыйны тэст, тэарэтычныя заданні ды прадэманстраваць навыкі аналітычнай работы з палявымі геаграфічнымі і геалагічнымі матэрыяламі. Усе заданні для школьнікаў падрыхтаваны і выконваліся на англійскай мове. Трэба заўважыць, што геаграфічныя міжнародныя алімпіяды з'яўляюцца адзінымі сярод прадметных алімпіяд, дзе матэрыялы для ўдзельнікаў не перакладаюцца на рускую мову. Таму, акрамя добрага ведання геаграфіі, ад удзельнікаў патрабуецца і свабоднае валоданне англійскай мовай.

Усяго ў iGeo-2021 прынялі ўдзел 200 школьнікаў з 46 краін. Сёлета спаборніцтва праходзіла ў анлайн-фармаце. Краінай-арганізатарам выступіла Турцыя. У наступным годзе спаборніцтвы арганізуе Францыя.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Дабрачыннасць

# ШТО ПАКЛАСЦІ Ў ЗАПЛЕЧНІК

**Працягваецца кампанія Беларускага Чырвонага Крыжа «Збяром дзяцей у школу!»**

**Штогадовая дабрачынная кампанія Беларускага Чырвонага Крыжа «Збяром дзяцей у школу!» накіравана на аказанне дапамогі дзецям з асаблівымі патрэбамі, з малазабяспечаных сем'яў, сем'яў бежанцаў і іншым.**

Дапамагчы ім сабраць школьны партфель можа кожны. Для гэтага трэба перадаць школьныя наборы ў адзін з офісаў арганізацыі. Звычайна ў школьны партфель ад Чырвонага Крыжа ўваходзяць пісьмовыя прылады (ручкі, алоўкі, акварэльныя фарбы і гуаш, пэндзлікі, пластылін), сшыткі, альбомы, каляровая папера і кардон, пеналы, нажніцы, клей-алоўак, гумкі, тачылкі, лінейкі, ёмістасці для малявання. Таксама арганізацыя прымае школьную і спартыўную форму, абутак і заплечнікі.

Тым, хто аддае перавагу анлайн-ахвяраванням, можна пералічыць дабрачынную суму на набыццё школьных набораў праз АРІП. Для гэтага ў дрэве АРІП выбраць «Дабрачыннасць, грамадскія аб'яднанні», «Дапамога дзецям, дарослым», «Беларускі Чырвоны Крыж», «Дабрачынныя ўзносы», выбраць адпаведную абласную арганізацыю і ўвесці нумар дабрачыннай акцыі — 222.

Па выніках кампаніі кожнаму, хто асабіста перадаў школьны набор, запоўніўшы анкету зваротнай сувязі, вышлюць падрабязную справаздачу аб выніках дабрачыннай кампаніі.

**Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.**

# Больш прасторы для развіцця

**Для маленькіх магіляўчан будуюць незвычайны садок з экалагічна чыстых матэрыялаў у мікрараёне Спадарожнік.**

Гэты будаўнічы праект зусім новы для Магілёва. Дзіцячы садок разлічаны на 200 месцаў. Яго ўзвядзенне вядзецца за кошт інвестара — славенскай кампаніі Riko. Частка работ выканана за бюджэтныя сродкі: падрыхтоўчыя работы, фундамент і падвядзенне камунікацый. Работа над узгадненнем праекта была доўгая і скрупулёзная. Дзіцячы садок у раёне стане трэцім па ліку. Гэта звязана з тым, што будынак нетыповы, аднапавярховы, каркасны, у яго адстройванні выкарыстоўваюцца экалагічна чыстыя матэрыялы. Акрамя таго, будуць устаноўлены панарамныя вокны, што зробіць прастору больш «паветранай» і адкрытай.

Асаблівасць праекта — яшчэ і шматфункцыянальнасць кожнага памяшкання. Так, напрыклад, гульнявая зможа лёгка трансфармавацца ў спальную зону, калі гэта неабходна, а ў глядзельнай зале прыступкі лёгка пераўтварацца ў сядзенні. Месца для будаўніцтва дзіцячага садка таксама абрана невыпадкова: мікрараён Спадарожнік досыць малады і актыўна развіваецца. Там жыве мноства маладых і шматдзетных сем'яў, больш за тое, плануецца працягваць будаваць жыллё. Адкрыць дзіцячы садок маркуюць у лістападзе бягучага года.

**Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.**

Экспертная супольнасць

# ГЭТА ТЭХНАЛОГІЯ І НІЧОГА БОЛЬШ

## Па якіх рэцэптах рыхтуюць сёння «каляровыя рэвалюцыі»?

**У сучаснай палітыцы «каляровыя рэвалюцыі» — адна з самых актуальных тэм, якія трымаюць грамадства ў стане пастаяннага напружання. Эксперты ўсё часцей кажуць пра тое, што ў апошнія гады імкліва развіваюцца новыя формы і метады «каляровых рэвалюцый», выкарыстоўваюцца сучасныя спосабы кіравання свядомасцю і паводзінамі грамадзян. Днямі споўніўся год, як у Беларусі, пасля выбараў Прэзідэнта, была зроблена спроба хуткай «каляровай рэвалюцыі». Дзейнічалі як пад капірку, з дапамогай прыкормленай «пятай калоны» і яе заходніх рэжысёраў. Але Беларусь апынулася ў ліку вельмі нешматлікіх краін, дзе «каляровая рэвалюцыя» не адбылася.**

**На думку доктара палітычных навук, прафесара факультэта паліталогіі Маскоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта Андрэя МАНОЙЛЫ, які выступіў экспертам падчас чарговай сустрэчы, арганізаванай у Міжнародным медыяклубе «Фармат А-3», галоўная небяспека «каляровых рэвалюцый» заключаецца ў тым, што з-за іх практычна ўсе краіны разам са сваім насельніцтвам і іншымі рэсурсамі цалкам трапляюць пад кантроль замежнай дзяржавы. Эксперт перакананы, што «каляровыя рэвалюцыі» ў рэшце рэшт прыводзяць да беспарадкаў, заняпаду народнага дабрабыту, і заўсёды ў пройгрышы аказваюцца простыя людзі.**

### Наша даведка



**Андрэй Манойла — прафесар кафедры расійскай палітыкі факультэта паліталогіі МДУ, член навуковага савета пры Савеце бяспекі Расійскай Федэрацыі, прарэктар Грамадзянскага ўніверсітэта «Адзіная Расія». У навуковай дзейнасці займаецца даследаваннямі ў сферы інфармацыйных войнаў, псіхалагічных аперацый, працэсаў «каляровым рэвалюцыям», кіраванаму хаосу і ідэалагічным дыверсіям. Яго навуковыя працы перакладзены на 12 моў. У Літве працы Андрэя Манойлы па інфармацыйных войнах атрымалі назву «рускі падыход» і з 2006 года выкладаюцца ў ваенных акадэміях.**

### СВЯДОМАСЦЬ АДКЛЮЧАЕЦЦА, КІРУЮЦЬ ІНСТЫНКТЫ

Што на сённяшні дзень уяўляюць з сябе «каляровыя рэвалюцыі» і наогул што гэта такое?

— Усе «каляровыя рэвалюцыі» — гэта вынік дзеяння адной і той жа тэхналогіі, — упэўнены эксперт. — То-бок гэта тэхналогія арганізацыі дзяржаўных пераваротаў, у якой выкарыстоўваецца кіраванне вялікімі масамі пратэстоўцаў, з якіх фарміруецца агрэсіўны палітычны натоўп (ці некалькі натоўпаў, як паказалі падзеі ў Беларусі, дзе выкарыстоўваўся не адзін асобна ўзяты «майдан», а прынцып рою, калі натоўпаў было шмат).

Эксперт тлумачыць механізм: натоўп вельмі хутка напампоўваецца агрэсіяй. Людзі, якія трапілі ў натоўп, страчваюць сваю індывідуальнасць, здольнасць крытычна ацэньваць тое, што адбываецца вакол, зліваюцца з натоўпам і становяцца часткай стыхіі.

— Натоўп — вельмі эфектыўны інструмент, для таго каб шантажыраваць (перш за ўсё дзеючую ўладу), — кажа Андрэй Манойла. — У гэтых адносінах вялікая колькасць выхаваных, культурных, добра адукаваных людзей страчвае гэтыя якасці і ператвараецца ў калектыўны «рой пчол». Свядомасць адключаецца, эмацыянальнае падаўляе рацыянальнае, кіраванне адбываецца на ўзроўні калектыўных рэфлексаў і інстынктаў.

Першай у шэрагу «каляровых», па сутнасці, стала «Бульдозерная рэвалюцыя» ў Югаславіі на мяжы 2000-х гадоў. У ёй ужо прысутнічае класічная «майданная» схема: фарміраванне пастаяннa дзеючага лагера з яго тылавым забеспячэннем, уцягванне туды розных пратэсных мас, ператварэнне іх у агрэсіўны палітычны натоўп і накіраванне яго супраць дзеючай улады.

— Вось гэтая класічная схема потым шматразова паўтаралася ва ўсіх кейсах і была рэалізавана на постсавецкай прасторы і за яе межамі, — тлумачыць эксперт. — Схема «каляровых рэвалюцый» праяўляла сябе і на іншых кантынентах: у Венесуэле і Балівіі. І да гэтага часу знаходзіцца ў аснове любых рэвалюцый.

### КАРАНАВІРУС БОЛЬШ ЭФЕКТЫЎНЫ ЗА ГУЛАГ

Праўда, лічыць эксперт, леташнія падзеі ў Беларусі адрозніваюцца ад класічнай схемы і мелі своеасаблівы сцэнарый:

— З аднаго боку, у аснове таго, што адбывалася на ніжнім узроўні (у аснове масавых выхадаў), ляжыць класічная схема «каляровай рэвалюцыі», роўна такая была ў Югаславіі ў 2000-м і затым ва Украіне, у Ганконгу, у Грузіі і гэтак далей, але без «майдана» — гэта схема мадыфікаваная, — кажа Андрэй Манойла. — З другога боку, у Беларусі сышліся так званыя прыёмы, тэхналогіі, рознага кшталту гаджэты і «прымочкі», якія былі адпрацаваны на працягу двух дзясяткаў гадоў у розных кейсах.



Ён звяртае ўвагу, што, нягледзячы на агульную схему «каляровай рэвалюцыі» ў Беларусі, схема сувязі і каардынацыі была цалкам узята з масавых беспарадкаў у Ганконгу (якая сфарміравалася ў 2019-м і пачатку 2020 года), пакуль ганконгскіх рэвалюцыянераў не распужаў каранавірус.

— Ён аказаўся больш эфектыўны, чым кітайскі ГУЛАГ, — перакананы эксперт. — Усе схемы (сувязі і каардынацыя пратэсных груп) як рэпліка перанесліся на беларускую глебу. Арганізацыя дзяржпераваротаў у Беларусі цалкам паўтарала такую схему, якая была ўпершыню распрацавана і выкарыстана ў 2019 годзе ў Венесуэле, так званая схема венесуэльскага прэцэдэнту.

Палітолаг лічыць, што рэжым Мадура цудам утрымаўся ва ўладзе, таму што схема была бездакорная, такая ж яна застаецца і цяпер. У Беларусі гэтая схема таксама праглядалася вельмі відавочна.

Тэхналогія канфліктнай мабілізацыі пад непалітычным парадкам (то-бок тэхналогіі, якія вызначаліся здольнасцю мабілізаваць у дзясяткі разоў больш людзей, чым тэхналогіі мабілізацыі пад дакладныя палітычная лозунгі) былі ўзятыя з «электрамайданаў» у Арменіі, дзе гэтыя тэхналогіі ўпершыню з'явіліся і даказалі сваю эфектыўнасць. Такім чынам, быў выкарыстаны цэлы шэраг найноўшых дасягненняў у галіне арганізацыі дзяржпераваротаў, якія былі сабраны ў Беларусі і скамбінаваны ў новую тэхналогію арганізацыі дзяржперавароту новага тыпу. І гэтым беларускі кейс быў цікавы, лічыць эксперт.

### МОДА ПРАХОДЗІЦЬ... І НА «КАЛЯРОВЫЯ РЭВАЛЮЦЫІ» ТАКСАМА

Што датычыцца саміх «каляровых рэвалюцый», з пункту гледжання Андрэя Манойлы, апошнім часам назіраецца не іх росквіт, а хутчэй занепад.

— Ці то мода на «каляровыя рэвалюцыі» стала праходзіць, ці то назіраецца маятнікавы рух арэляў, калі ў свой час адышлі ад класічных дзяржпераваротаў (гвалтоўнага захопу і ўтрымання ўлады, здрады кагосьці з асяроддзя лідара, плюс ваенны складнік) і перайшлі да «каляровых рэвалюцый», дзе рабілася тое ж самае, толькі пад нейкім прыкрыццём масавага рашэння народа, які быццам бы вырашыў вярнуць сабе ўладу, — кажа эксперт.

Палітолаг звяртае ўвагу на апошнія падзеі ў Венесуэле ці Балівіі, дзе знешне ўсё нагадвала «каляровую рэвалюцыю» (масавыя пратэсты, людзі на вуліцах), але пры гэтым цэнтра кіравання пратэстамі не было і ўсё нагадвала дзею, якая адцягвала ўвагу цэнтральнай улады ад падзей, што адбываліся ў найбліжэйшым атачэнні лідараў гэтых дзяржаў. А там вяліся перагаворы амерыканцаў, якія шукалі слабае звяно — здраднікаў.

— У Венесуэле яны гэтае слабае звяно знайшлі і практычна завербавалі, але цудам аперацыя была выкрыта і нічога не атрымалася, — тлумачыць Андрэй Манойла. — А ў Балівіі — атрымалася, таму штоماралес супрацiўляўся роўна да таго моманту, пакуль камандуючы войскамі не параіў яму пакінуць пасаду прэзідэнта. І зрабіў гэта настолькі пераканаўча, што Маралес не стаў рабіць ніякіх заяў: сеў у самалёт, зляцеў у Мексіку, а ўжо адтуль звярнуўся да нацыі: маўляў, так атрымалася, прабачце, я ўжо не тут...

Таму, з пункту погляду эксперта, пры ўсёй эфектыўнасці тэхналогій цяпер назіраецца крызіс усіх «каляровых рэвалюцый». І ідзе відавочная тэндэнцыя вяртання да папярэдніх, больш хуткіх гвалтоўных метадаў арганізацыі дзяржпераваротаў. Схема: знайсці здрадніка, завербаваць яго, арганізаваць пераварот і растлумачыць, чаму лідара скінулі.

— Для таго каб працэс пошуку, вярбоўкі і выбудоўвання праходзіў без перашкод з боку нацыянальных органаў дзяржбяспекі, вельмі часта арганізоўваюць імітацыю «каляровай рэвалюцыі», — тлумачыць палітолаг.

### НЕ БЛЫТАЦЬ З ГІБРЫДНАЙ ВАЙНОЙ

Яшчэ адзін цікавы момант, на які звярнуў увагу эксперт: тэрміны «каляровая рэвалюцыя» і «гібрыдная вайна» часта выкарыстоўваюцца ў якасці сінонімаў. Аднак з'явы, па сутнасці, абсалютна розныя.

— Праўда, яны часта ці перакрыжоўваюцца, ці камбінуюцца, — тлумачыць сутнасць блытаніны Андрэй Манойла. — І ў адных і тых жа сітуацыях «каляровая рэвалюцыя» можа праходзіць як этап гібрыднай вайны.

Ён удакладняе: гібрыдная вайна — гэта вайна, якая прадугледжвае дасягненне сваёй мэты камбінаваннем розных формаў ваеннага і неваеннага ўздзеяння. То-бок аперацыі гібрыднай вайны могуць уключаць у сябе дзеянні як па традыцыйным уводзе войскаў, так і разнастайныя дзеянні «нонкамбатант» (транснацыянальных структур арганізаванай злачыннасці, наркакартэляў, сіндыкатаў і гэтак далей). Усё гэта збіраецца разам — і атрымліваюцца аперацыі гібрыднага тыпу.

— Адначасова з ваеннымі аперацыямі могуць праводзіцца аперацыі інфармацыйнай вайны (гэта асобы від аперацый, якія праводзяць, як правіла, выключна разведслужбы) з выкарыстаннем новых формаў і метадаў разведвальнага ўздзеяння, — кажа палітолаг. — Могуць праводзіцца аперацыі гандлёвай, эканамічнай вайны, усё гэта можа камбінавацца з вельмі агрэсіўнай дыпламатыяй.

Такая камбінацыя (дзеянне традыцыйных сіл і інфармацыйных, гандлёвых, эканамічных, дыпламатычных аперацый) і ўяўляе з сябе гібрыдную вайну.

— «Каляровыя рэвалюцыі» як тэхналогіі арганізацыі дзяржаўнага перавароту могуць быць часткай гібрыднай вайны, калі яны камбінуюцца яшчэ з нечым. Але самі па сабе «каляровыя рэвалюцыі» — гэта вельмі прыватны аспект, тэхналогія, якая паўтараецца ва ўсіх кейсах, — адзначае Андрэй Манойла.

### ЧАМУ «ПРАКАЛОЛІСЯ» Ў БЕЛАРУСІ?

— Дала збой іх асноўная тактыка — хутка змяніць палітычны рэжым у Беларусі. Хутка не атрымалася, хоць усё рабілася менавіта для таго, каб гэта адбылося, і падтрымка была каласальная не толькі матэрыяльная і фінансавая з-за мяжы, — лічыць палітолаг. — Я перакананы, што найлепшыя заходнія паліттэхнолагі працавалі якраз над гэтым, таму што ўсе найноўшыя тэхналогіі дэстабілізацыі палітычных рэжымаў, якія з'явіліся на працягу апошніх двух гадоў на Захадзе, былі ўжытыя ў Беларусі для таго, каб зрынуць дзеючы палітычны рэжым, гэта значыць зладзіць дзяржаўны пераварот гвалтоўным шляхам.

Але расслабляцца не трэба: гэта не апошняя спроба дасягнуць сваёй мэты. Эксперт перакананы, з падзей мінулага года арганізатары вынеслі пэўны ўрок, цяпер на аснове аналізу памылак тэхналогія будзе мадыфікавана і ўдасканалена. І тут можна не сумнявацца — захады па змене дзяржаўнага ладу ў нашай краіне не спыняцца з-за леташняга правалу. Таму пільнасць страчваць нельга ні пры якіх абставінах.

**Вольга АЛЯКСАНДРАВА.**

Центр Промышленной Оценки

**• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ • ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5** |
| **Продавец** | **ОАО «Щучинский ремонтный завод», Гродненская обл., Щучинский р-н, а. г. Рожанка, ул. Советская, 52А** |
| **Оператор ЭТП** | **ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 46** |
| **Адрес ЭТП** | **www.ipmtorgi.by** |

## Предмет электронных торгов – ПРОИЗВОДСТВЕННАЯ БАЗА

**Адрес: Гродненская обл., Щучинский р-н, Рожанковский с/с, п. Рожанка, ул. Вокзальная, 18**

| Наименование | Общ. пл. | Инв. номер | Адрес (№ дома) |
|---|---|---|---|
| **Здание трансформаторной подстанции ЗТП-Щ-47** | 38,6 кв. м | 422/С-65353 | 12Б |
| **Проходная** | 21,1 кв. м | 422/С-3362 | д. 18А |
| **Гараж** | 89,2 кв. м | 422/С-3363 | д. 18Б |
| **Контора** (составные части: пристройка) | 201,8 кв. м | 422/С-3361 | д. 18 |
| **Контора нефтебазы** | 105,5 кв. м | 422/С-15365 | 18, корп. 7 |
| **Арочный склад** | 847,1 кв. м | 422/С-3365 | д. 18В |
| **Склад хозтоваров и стройматериалов** | 1127,7 кв. м | 422/С-3366 | д. 18Г |
| **Склад запасных частей автомобилей и сельскохоз. машин** | 1128,5 кв. м | 422/С-15363 | д. 18Е |
| **Склад металлометизовый** | 1113,2 кв. м | 422/С-15362 | д.18Д |
| **Механический цех** (составные части: пристройка) | 899,3 кв. м | 422/С-3364 | д. 18Ж |
| **Сооружение благоустройства** | 27813,4 кв. м | 422/С-64993 | д. 18 |

Составные части и принадлежности: бордюр, смотровая вышка, подкран. площадка, тротуар для подъезда к складу, асфальт. площадка, дорога подъездная с площадкой, площадка ж/б, ограждения, цветник, подпорная стена, резервуар

***Сведения о земельных участках*** – предоставлены продавцу на праве постоянного пользования: пл. **0,0083 га** для обслуживания здания ТП Щ-47 и пл. **8,7065 га** для содержания и обслуживания производственно-торговой базы. Ограничения (обременения) прав: охранные зоны линий электропередачи, пл. 0,0824 га

***Обременения***: частичная аренда. Подробнее на сайте организатора аукциона

**Начальная цена лота с НДС 20 % – 980 160,87 бел. руб.** (снижена на 10 %)

**Задаток по лоту 5 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в ОАО «Белинвестбанк» г. Минск, БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 30 (тридцать)** рабочих дней после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение 30 (тридцати) календарных дней после заключения договора купли-продажи

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов, установлен регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги» размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов, либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 08.07.2021

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

| | |
|---|---|
| **Дата и время начала и окончания электронных торгов** | **Начало торгов: 14.00 31.08.2021.**<br>**Окончание торгов: 15.00 31.08.2021.**<br>Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов |
| **Дата и время окончания приема заявок** | **Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 30.08.2021 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу www.ipmtorgi.by** |

**Контактные телефоны: +375 17-373-21-33; +375 (44) 704-92-06. E-mail: auction@cpo.by**

**Гомельский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении 20 сентября 2021 г. в 10.00 открытого аукциона по продаже автотранспортных средств, принадлежащих Унитарному предприятию «Санаторий «Приднепровский» на праве хозяйственного ведения**

| № лота | Наименование, краткая характеристика объекта | Начальная цена, рублей (в т. ч. НДС по ставке 20 %) | Задаток, рублей (в т. ч. НДС по ставке 20 %) |
|---|---|---|---|
| 1 | **Грузопассажирский автомобиль VOLKSWAGEN CADDY, регистрационный знак АВ 6515-3, год выпуска 2008.** Цвет: темно-синий металлик. Тип: грузопассажирский вагон. Номер кузова (рамы): WV2ZZZ2KZ8X156568. Объем двигателя: 1900 см³. Вид топлива: дизель. Состояние: автомобиль находится в аварийном состоянии после ДТП | **5 880,00** | **588,00** |
| 2 | **Грузовой автомобиль MAZ 5340 A5-370-010, регистрационный знак АЕ 9698-3, год выпуска 2011.** Цвет: белый. Тип: грузовой бортовой тентовый. Номер кузова (рамы): Y3M5340A5B0000256. Объем двигателя: 14860 см³. Вид топлива: дизель. Состояние: автомобиль находится в исправном состоянии | **24 480,00** | **2 448,00** |
| 3 | **Грузовой автомобиль ZIL 431412, регистрационный знак АК 3585-3, год выпуска 1987.** Цвет: темно-зеленый. Тип: грузовой бортовой. Номер кузова (рамы): 2613247. Объем двигателя: 6000 см³. Вид топлива: бензин. Состояние: автомобиль находится в исправном состоянии | **5 280,00** | **528,00** |
| 4 | **Грузовой автомобиль GAZ-3302 KUPAVA 232510, регистрационный знак АМ 4932-3, год выпуска не определен.** Цвет: белый. Тип: грузовой специальный фургон изотермический. Номер кузова (рамы): б/н. Объем двигателя: 2900 см³. Вид топлива: бензин. Состояние: автомобиль находится в исправном состоянии | **3 600,00** | **360,00** |

**Местонахождение имущества:** Гомельская область, Рогачевский район, п. Приднепровский, ДУП «Санаторий «Приднепровский». Место проведения аукциона: г. Гомель, ул. Артема, 23, каб. 1.1. Заявления на участие в аукционе с приложением необходимых документов принимаются по адресу: **г. Гомель, ул. Артема, 23, 2-й этаж, каб. 2-6** по рабочим дням с 9.00 до 12.00 и с 13.00 до 16.00 **по 16.09.2021 г. включительно**. Подача документов по почте не допускается. Заявления, поступившие позже установленного срока, не рассматриваются.

В аукционе имеют право участвовать индивидуальные предприниматели, физические и юридические лица, своевременно подавшие заявление на участие в аукционе с приложением необходимых документов, внесшие задаток по заявляемому лоту до подачи заявления и прошедшие заключительную регистрацию с 09.00 до 10.00 **20.09.2021 г.**

Аукционные торги проводятся в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь и Положением о порядке организации и проведения аукционов, утвержденным Организатором торгов. Шаг аукциона – 5 %.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену на аукционе; лицом, приравненным к победителю, признается единственный зарегистрированный участник, выразивший согласие купить предмет торгов по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

**При подаче заявления участник должен иметь**: 1) копию платежного документа с отметкой банка, подтверждающего внесение задатка для участия в аукционе; 2) физическое лицо – паспорт; представитель физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность; индивидуальный предприниматель – паспорт, копию свидетельства о государственной регистрации и его подлинник для заверения его копии организатором аукциона; представитель индивидуального предпринимателя – паспорт и нотариально заверенную доверенность; представитель юридического лица (резидент РБ) – паспорт (руководитель – копию документа подтверждающего назначение на должность), доверенность на участие в аукционе и подписание документов, копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации юридического лица и их подлинники для заверения их копий организатором аукциона; представитель юридического лица (нерезидент РБ) – легализованные в установленном порядке доверенность на участие в аукционе и подписание документов (руководитель – копию документа, подтверждающего назначение на должность), копии учредительных документов и выписку из государственного (торгового) реестра юридических лиц страны происхождения (выписка должна быть датирована не позднее шести месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенными переводами на белорусский (русский) язык.

В случае отсутствия у физического лица текущего счета необходимо его открыть.

Задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления на **р/с BY49AKBB30120000101350000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Гомель, БИК AKBBBY2X. Получатель платежа – Гомельский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки». УНП 401166490. Назначение платежа:** задаток для участия в аукционе по лоту №__ согласно извещению в газете «Звязда» от 18.08.2021г. Участник торгов, желающий участвовать в торгах в отношении нескольких предметов торгов, вносит задатки в размере, установленном для каждого лота.

Задаток, уплаченный участником аукциона, ставшим победителем (лицом, приравненным к победителю аукциона), будет засчитан в счет окончательной стоимости Объекта. Задатки, уплаченные участниками аукциона, не ставшими победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона), Организатор аукциона возвращает безналичным платежом на их счета в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.

**Победитель торгов (лицо, приравненное к победителю аукциона) обязан**: в течение 3 рабочих дней после подписания протокола о результатах аукциона уплатить Организатору аукциона вознаграждение по результатам аукциона в размере четыре процента от цены продажи Объекта, сформированной в установленном порядке; в течение 5 календарных дней после подписания протокола о результатах аукциона заключить с Продавцом договор купли-продажи Объекта; в сроки, согласно заключенному договору купли-продажи, выплатить Продавцу стоимость Объекта, сформированную в установленном порядке. Если между Продавцом и Победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) в течение срока, установленного для заключения договора купли-продажи Объекта, не достигнута договоренность по срокам и порядку оплаты Объекта, такая оплата должна быть произведена в течение 10 календарных дней с момента заключения договора купли-продажи Объекта.

**Организатор: Гомельский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гомель, ул. Артема, 23.**
**Тел.: 8 (0232) 32-46-47; 32-18-95; 8 (029) 170-46-47. Сайт: gino.by; e-mail: auction-gino@gino.by.**
**Продавец: Унитарное предприятие «Санаторий «Приднепровский»,**
**Гомельская обл., Рогачевский р-н, пос. Приднепровский. Тел.: 8 (029) 346-60-45, 8 (044) 709-59-99.**

# РУП «Торговый дом «Восточный»

## извещает о проведении 09.09.2021 открытого аукциона по продаже недвижимого имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства

__Лот № 1.__ Капитальное строение с инвентарным номером 320/С-19414 общей площадью 103,6 кв. м, расположенное по адресу: Гомельская обл., Жлобинский р-н, Солонский с/с, 37В/2. Назначение: здание неустановленного назначения; наименование: здание сушильной камеры. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 321800000001000051 площадью 2,5424 га (право аренды). **Начальная цена продажи – 11 145,60 бел. рублей, задаток – 1 114,56 бел. рублей. Шаг аукциона – 5 %.**

__Лот № 2.__ Земельный участок с кадастровым номером 321882803601000011 площадью 0,2500 га (право собственности), расположенный по адресу: Гомельская обл., Жлобинский р-н, Лукский с/с, д. Зелёный Кряж, ул. Зелёная, 3. Целевое назначение: земельный участок для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (земельный участок для размещения объектов усадебной застройки) (строительства и обслуживания жилого дома) с объектами обслуживания). **Начальная цена продажи – 1 464,30 бел. рублей, задаток – 146,43 бел. рублей. Шаг аукциона – 5 %.**

__Лот № 3.__ Капитальное строение с инвентарным номером 631/С-66554, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 621350100005001121 площадью 5,3127 га (право аренды) по адресу: Минская обл., Вилейский р-н, г.Вилейка, пер.Гидростроителей. Назначение: сооружение специализированное железнодорожного транспорта, наименование: подъездной железнодорожный путь. *Составные части и принадлежности: сооружение, оборудованное согласно техническому паспорту на сооружение от 02.11.2020 б/н, составленному по состоянию на 29.10.2020.* **Начальная цена продажи – 446 688,00 бел. рублей, задаток – 44 668,80 бел. рублей. Шаг аукциона – 5 %.**

__Лот № 4.__ Капитальное строение с инвентарным номером 631/С-57235 общей площадью 353,4 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Вилейский р-н, г. Вилейка, пер. Гидростроителей, д. 10. Назначение: здание специализированное для производства строительных материалов; наименование: бетонно-смесительный узел. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 621350100005001121 площадью 5,3127 га (право аренды). **Начальная цена продажи – 24 550,94 бел. рублей, задаток – 2 455,09 бел. рублей. Шаг аукциона – 5 %.**

__Лот № 5__. Капитальное строение с инвентарным номером 631/С-57230 общей площадью 1 130,3 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Вилейский р-н, г. Вилейка, пер. Гидростроителей, д. 10. Назначение: здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ; наименование: центральный склад. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 621350100005001121 площадью 5,3127 га (право аренды). **Начальная цена продажи – 320 309,47 бел. рублей, задаток – 32 030,95 бел. рублей. Шаг аукциона – 5 %.**

__Лот № 6.__ Капитальное строение с инвентарным номером 500/С-26075 общей площадью 944,0 кв. м *(общая площадь в соответствии с копией технического паспорта, составленного по состоянию на 16.11.2020: 889,9 кв. м)*. Назначение: здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ; наименование: склад, Е 1/к. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 500000000008002190 площадью 2,0948 га (право постоянного пользования) по адресу: г. Минск, ул. Старовиленская, 131. *На объекте имеется арендатор.* **Начальная цена продажи – 396 576,00 бел. рублей, размер задатка – 39 657,60 бел. рублей. Шаг аукциона – 5 %.**

__Лот № 7.__ Единый объект недвижимого имущества в составе:

Изолированное помещение с инвентарным номером 350/D-177527 общей площадью 595,7 кв. м, расположенное по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Подгорная, 10-1. Назначение: административное помещение; наименование: административное помещение (часть капитального строения с инвентарным номером 350/С-82507).

Изолированное помещение с инвентарным номером 350/D-177532 общей площадью 538,3 кв. м, расположенное по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Подгорная, 10-2. Назначение: помещение неустановленного назначения; наименование: помещение неустановленного назначения (часть капитального строения с инвентарным номером 350/С-82507).

Капитальное строение с инвентарным номером 350/С-160810, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 340100000001005598 (присвоен предварительно). Назначение: сооружение специализированное энергетики; наименование: тепловая сеть. *Составные части и принадлежности: подземная бесканальная водяная сеть, состоящая из 8 элементов минимальной глубины прокладки – 0,54 м, максимальной глубиной прокладки – 2 м, общей протяженностью 55,7 м, колодцев (камер) – 5 шт. (тепловая сеть от места врезки до административного здания по ул. Подгорная, 10).* **Начальная цена продажи – 379 584,00 бел. рублей, размер задатка – 37 958,40 бел. рублей. Шаг аукциона – 5 %.**

__Лот № 8.__ Изолированное помещение с инвентарным номером 350/D-164507 общей площадью 16,0 кв. м, расположенное по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Пушкина, д. 11. Назначение: административное помещение; наименование: административное помещение. *Объект имеет статус историко-культурной ценности.* **Начальная цена продажи – 31 644,00 бел. рублей, размер задатка – 3 164,40 бел. рублей. Шаг аукциона – 5 %.**

__Лот № 9.__ Земельный участок с кадастровым номером 624485200002000155 площадью 0,0396 га (право собственности), расположенный по адресу: Минская обл., Пуховичский р-н, Пуховичский с/с, СТ «Веленский Ветеран». Целевое назначение: садоводство в садоводческом товариществе «Ветеран». **Начальная цена продажи – 716, 76 бел. рублей, задаток – 71,68 бел. рублей. Шаг аукциона – 5 %.**

__Лот № 10.__ Земельный участок с кадастровым номером 624485200002000154 площадью 0,0400 га (право собственности), расположенный по адресу: Минская обл., Пуховичский р-н, Пуховичский с/с, СТ «Веленский Ветеран». Целевое назначение: садоводство в садоводческом товариществе «Ветеран». **Начальная цена продажи – 724,00 бел. рублей, задаток – 72,40 бел. рублей. Шаг аукциона – 5 %.**

__Лот № 11.__ Изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-798816295 общей площадью 15,6 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Лукьяновича, 2В-206. Наименование: машино-место. Назначение: машино-место (машино-место № 64). **Начальная цена продажи – 12 474,00 бел. рублей, задаток – 1 247,40 бел. рублей. Шаг аукциона – 5 %.**

__Лот № 12.__ Изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-798816296 общей площадью 16,5 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Лукьяновича, 2В-190. Наименование: машино-место. Назначение: машино-место (машино-место № 69). **Начальная цена продажи – 12 879,00 бел. рублей, задаток – 1 287,90 бел. рублей. Шаг аукциона – 5 %.**

__Лот № 13.__ Изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-798816298 общей площадью 15,8 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Лукьяновича, 2В-163. Наименование: машино-место. Назначение: машино-место (машино-место № 72). **Начальная цена продажи – 12 555,00 бел. рублей, задаток – 1 255,50 бел. рублей. Шаг аукциона – 5 %.**

__Лот № 14.__ Изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-798816297 общей площадью 15,5 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Лукьяновича, 2В-162. Наименование: машино-место. Назначение: машино-место (машино-место № 73). **Начальная цена продажи – 12 474,00 бел. рублей, задаток – 1 247,40 бел. рублей. Шаг аукциона – 5 %.**

__Лот № 15.__ Изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-798816299 общей площадью 15,6 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Лукьяновича, 2В-183. Наименование: машино-место. Назначение: машино-место (машино-место № 77). **Начальная цена продажи – 12 474,00 бел. рублей, задаток – 1 247,40 бел. рублей. Шаг аукциона – 5 %.**

__Лот № 16.__ Изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-798816300 общей площадью 15,8 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Лукьяновича, 2В-184. Наименование: машино-место. Назначение: машино-место (машино-место № 78). **Начальная цена продажи – 12 555,00 бел. рублей, задаток – 1 255,50 бел. рублей. Шаг аукциона – 5 %.**

__Лот № 17.__ Изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-798816301 общей площадью 13,5 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Лукьяновича, 2В-186. Наименование: машино-место. Назначение: машино-место (машино-место № 80). **Начальная цена продажи – 11 502,00 бел. рублей, задаток – 1 150,20 бел. рублей. Шаг аукциона – 5 %.**

__Лот № 18.__ Изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-798816302 общей площадью 13,5 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Лукьяновича, 2В-187. Наименование: машино-место. Назначение: машино-место (машино-место № 81). **Начальная цена продажи – 11 502,00 бел. рублей, задаток – 1 150,20 бел. рублей. Шаг аукциона – 5 %.**

__Лот № 19.__ Изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-798816303 общей площадью 15,6 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Лукьяновича, 2В-164. Наименование: машино-место. Назначение: машино-место (машино-место № 83). **Начальная цена продажи – 12 474,00 бел. рублей, задаток – 1 247,40 бел. рублей. Шаг аукциона – 5 %.**

__Лот № 20.__ Изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-798816304 общей площадью 15,4 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Лукьяновича, 2В-165. Наименование: машино-место. Назначение: машино-место (машино-место № 84). **Начальная цена продажи – 12 393,00 бел. рублей, задаток – 1 239,30 бел. рублей. Шаг аукциона – 5 %.**

**УСЛОВИЯ**

1. Победитель аукциона либо в случае, если заявление на участие в аукционе подано только одним участником, и он согласен приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на 5 (пять) процентов (далее – Претендент на покупку), не позднее 3 (трех) рабочих дней со дня проведения аукциона на основании счета-фактуры возмещает затраты на организацию и проведение аукциона и оплачивает стоимость приобретенного объекта не позднее 20 (двадцати) рабочих дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.

2. На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для победителя аукциона. Организация и проведение аукциона осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.

3. Порядок проведения аукциона, в том числе об оформлении участия в аукционе, указан на сайте konfiskat.by в разделе «Недвижимость».

**Аукцион состоится 09.09.2021 в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. Жилуновича, 15, офис 318, зал для аукционов.**

Заявление на участие с приложением необходимых документов, в том числе документа, подтверждающего внесение суммы задатка (задатков) **с отметкой банка**, принимаются по адресу: г. Минск, ул. Жилуновича, 15, офис 318 (управление реализации недвижимости и арендных отношений) в рабочие дни: пн.–чт. – с 08.30 до 13.00, с 14.00 до 17.30, пт. – с 8.30 до 13.00, с 14.00 до 16.15.

**Окончание приема заявлений – 06.09.2021 в 15.00.**

Задаток перечисляется на расчетный банковский счет BY07 MMBN 3012 0000 0101 0165 3934, БИК MMBN BY22, в ОАО «Банк Дабрабыт», г. Минск, ул. Коммунистическая, 49, пом. 1, получатель – РУП «Торговый дом «Восточный», УНП 101127633, ОКПО 37411910. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже капитального строения (изолированного помещения), Лот №___, проводимом **09 сентября 2021 года.**

**Лот может быть снят с аукциона Организатором по письменному указанию Департамента по гуманитарной деятельности Управления делами Президента Республики Беларусь в любое время до объявления его проданным.**

**Контакты организатора аукциона: +375 17 378 87 02; +375 44 763 62 63.**

# КАПРАМОНТ У МЕТРАХ І РУБЛЯХ

**Міжрамонтны тэрмін жылля ў Беларусі ў сярэднім складае 35 гадоў, аднак на справе ён значна большы, бо капітальна адрамантаваць усе будынкі згодна з іх узростам у краіне не паспяваюць. Аднак за гэты час дом можа крыху падфарбавацца ў межах бягучага рамонту. Згодна з планам, штогод у Беларусі павінны рамантаваць не менш за 3 % ад жылфонду, які эксплуатуецца, а гэта 3 млн 540 тысяч м². Сёлета ў эксплуатацыю ўведзена ўжо крыху больш за траціну — 1 млн 176 тысяч м², каля 370 тысяч м² з якіх — у сталіцы. Пра выкананне капрамонту ў краіне расказалі эксперты жыллёвай гаспадаркі.**

## ДОМ — ЗА КОШТ БЮДЖЭТУ, ПАД'ЕЗД — ЗА ГРОШЫ ЖЫЛЬЦОЎ

Капітальны рамонт выконваецца ў межах дзяржпраграмы «Камфортнае жыллё і спрыяльнае асяроддзе». Сёлетняя дынаміка ўводу жылля пасля капрамонту на 24 % больш станоўчая, чым летась. Аднак асноўная маса ўводу жылля прыпадае на трэці квартал, паколькі на пачатак года прыходзіцца работы па праектаванні, падрыхтоўцы заданняў, правядзенні сходаў з насельніцтвам, расказаў **Андрэй РАМАШКА, начальнік упраўлення жыллёвай гаспадаркі Мінжылкамгаса:**

*— Ацэньваючы бягучыя графікі аблвыканкамаў, у якіх знаходзяцца 1289 дамоў з плошчай уводу 3 млн 671,5 тыс. м², мы прагназуем выкананне плана ў цэлым па годзе. Гэта датычыцца тэхнічных мерапрыемстваў, без уліку фінансавання і падаражання будаўнічых матэрыялаў.*

Летась у сталіцы капітальна адрамантавана 187 дамоў плошчай 973,9 тысячы м², на што пайшло 176,6 млн рублёў з мясцовага бюджэту і адлічэнняў уласнікаў (каля 40 % ад сумы агульнага фінансавання). Сёлета ў Мінску да капрамонту запланаваны 1 млн 74 тысячы м² жылля (241 дом), на што выдзелена 234 млн рублёў. На 2022 год запланавана на капрамонт 1 млн 77 тысяч м², акрэсліў **Ігар ГАНЧАРЫК, намеснік галоўнага інжынера Мінскай гарадской жыллёвай гаспадаркі:**

**«Падчас капрамонту будуць працягваць аднаўляцца за кошт бюджэту ўласцівасці канструктыўных элементаў, якія былі закладзены ў доме першапачаткова згодна з нормамі часу будаўніцтва жылля. Аднак на практыцы часта гэтая работа — простае атынкоўванне тонкім слоем пліты перакрыцця, каб вярнуць ёй страчаныя ўласцівасці па супрацiўленні цеплаперадачы».**

*— Асноўныя віды работ — рамонт дахаў, балконаў, казыркоў, уваходаў у пад'езды і ганкаў, замена сетак вода- і газазабеспячэння, каналізацыі, а таксама магістраляў ацяплення. У месцах агульнага карыстання мяняюцца радыятары і вокны, электрычныя і слаботакавыя шчыткі. Пасля замены інжынерных камунікацый аднаўляецца аздабленне ў месцах агульнага карыстання і добраўпарадкаванне ў дварах. Пасля капрамонту робіцца рамонт у пад'ездах (за кошт жыльцоў).*

## НОВЫЯ ТЭХПАТРАБАВАННІ МІНУС УЦЯПЛЕННЕ ФАСАДАЎ

Мінжылкамгас і Мінбудархітэктуры разглядаюць магчымыя змены ў тэхнічнае нарміраванне капрамонту. Хутчэй за ўсё будзе прапанавана распрацоўка нейкіх тэхнічных патрабаванняў або будаўнічых правіл па арганізацыі выканання капітальнага рамонту, які будзе абавязковы менавіта з тэхнічнага пункту гледжання гэтага працэсу. Існуе таксама патрэба ва ўдакладненні пераліку работ, якія робяцца падчас капрамонту, заўважыў Андрэй Рамашка:

*— Найперш гэта выклікана тым, што ўжо гады два як дзейнічае палажэнне Прэзідэнта ў частцы рэалізацыі энергаэфектыўных мерапрыемстваў, дзе ўласнікам асобна прапануюць умовы для суфінансавання гэтых мерапрыемстваў (пакрыццё ўласнікамі на працягу дзесяці гадоў паловы сумы, затрачанай бюджэтам на энергаэфектыўныя мерапрыемствы). Таму сёлета мяркуецца выключыць са складу работ тыя, якія непасрэдна звязаны з энергаэфектыўнымі.*

Прынамсі, гэта датычыцца ўцяплення фасадаў. Тым не менш падчас капрамонту будуць працягваць аднаўляцца за кошт бюджэту ўласцівасці канструктыўных элементаў, якія былі закладзены ў доме першапачаткова згодна з нормамі часу будаўніцтва жылля. Аднак на практыцы часта гэтая работа — простае атынкоўванне тонкім слоем пліты перакрыцця, каб вярнуць ёй страчаныя ўласцівасці па супрацiўленні цеплаперадачы.

*— Пастанова № 324, якая вызначае парадак планавання, правядзення і фінансавання капрамонту жылля, не вызначае пералік работ, якія неабходна выконваць падчас капрамонту. Гэты дакумент вызначае толькі магчымасць накіравання бюджэтных сродкаў менавіта на гэтыя работы, — акцэнтаваў увагу начальнік упраўлення.*

Рашэнне аб рэканструкцыі і замене сістэм ацяплення, якія ўключаны ў сцены ў старых «панэльках», і вынасе іх унутр памяшканняў будзе прымацца індывідуальна, дадаў Андрэй Рамашка:

*— Аднак такія работы ўсё ж больш падпадаюць пад паняцце энергаэфектыўных мерапрыемстваў, таму калі сістэма забяспечвае сацыяльныя стандарты па ацяпленні ў жыллі (не менш за 18°С) і яна тэхнічна спраўная, то мяняць яе не будуць.*


Фота Ірыны СІДАРОК.

Ліфты ў дамах павінны мяняцца кожныя 25 гадоў, аднак яны таксама эксплуатуюцца значна даўжэй. Некалькі гадоў таму ў краіне было каля 13 тысяч ліфтаў са звышнарматыўным тэрмінам выкарыстання, таму прынялі дзяржпраграму «Бяспечны ліфт», у межах якой за апошнія тры гады замянілі каля 11,5 тысячы ліфтаў. Да 2023 года ў Беларусі плануюць замяніць усе старыя ліфты, аднак гэта не азначае, што падчас капрамонту ў доме заменяць ужо замененыя ліфт.

ЖКГ: ёсць нюансы

# ЭЛЕКТРЫЧНАСЦЬ — АДНА, ТАРЫФАЎ — ШМАТ

## Хто і калі мае права плаціць менш

**Павелічэнне электраспажывання ў Беларусі — справа, да якой спецыялісты заклікаюць і вабяць, спасылаючыся на зручнасць, прастату і меншыя тарыфы для тых, хто выкарыстоўвае электрычнасць для ацяплення, гарачага водазабеспячэння і гатавання ежы. Аднак кошт электрычнага энерганосьбіта адрозніваецца для розных катэгорый жыхароў і часу сутак. Якім чынам — карэспандэнту «Звязды» дапамагаў разбірацца Віктар ЖЫТКЕВІЧ, начальнік упраўлення збыту электраэнергіі «Белэнерга».**

## УСЕ ЛІЧЫЛЬНІКІ — ШМАТТАРЫФНЫЯ

З 1 снежня 2018 года ў краіне была ўведзена тарыфная група электраэнергіі пры ўмове яе выкарыстання для патрэб ацяплення, ацяплення і гарачага водазабеспячэння ў жылых дамах і кватэрах, абсталяваных сістэмамі цэнтралізаванага цепла- і газазабеспячэння, электраплітамі **пры адсутнасці асобнай дадатковай прылады індывідуальнага ўліку расходу электраэнергіі** для патрэб ацяплення, ацяплення і гарачага водазабеспячэння. Гэты тарыф з 1 студзеня 2021 года складае **8,94 капейкі за 1 кВт/г.**

З 1 студзеня 2019-га ўстаноўлена **тарыфная група электраэнергіі** для патрэб ацяплення, ацяплення і гарачага водазабеспячэння ў жылых дамах і кватэрах, якія не абсталяваны сістэмамі цэнтралізаванага



цепла- і газазабеспячэння **пры наяўнасці асобнай дадатковай прылады індывідуальнага ўліку расходу электраэнергіі** для патрэб ацяплення, ацяплення і гарачага водазабеспячэння. З 1 снежня 2021-га ён складае **3,74 капейкі за 1 кВт/г.** Цяпер па абазначаных тарыфах разлічваецца ўжо 16 тысяч абанентаў, якія падключылі электраўстаноўкі.

З 1 красавіка 2020 года асобныя катэгорыі грамадзян могуць аплачваць **электраэнергію па субсідзіраваным тарыфе з прымяненнем паніжальнага каэфіцыента 0,85.** Такіх абанентаў прыкладна 51 тысяча. Ім могуць карыстацца грамадзяне жылых дамоў і кватэр, якія маюць сістэмы цэнтралізаванага цеплазабеспячэння на мэты ацяплення і газазабеспячэння для гатавання ежы і не абсталяваны электраплітамі, сістэмамі цэнтралізаванага гарачага водазабеспячэння і індывідуальнымі газавымі водананагравальнікамі. З 1 мая сёлета паніжальны кафэцыент 0,85 прымяняецца і для грамадзян у аднакватэрных жылых дамах, блакіраваных кватэрах і шматкватэрных будынках, пералічыў Віктар Жыткевіч:

*— Сёння ўсе лічыльнікі электраэнергіі, якія вырабляюцца ў Беларусі, шматтарыфныя з вялікім запасам захоўвання інфармацыі па электраспажыванні ў разрэзе дня, месяца і года. Для павышэння класа дакладнасці такіх прыбораў да 2023 года старыя індукцыйныя прылады ўліку з класам дакладнасці 2,5 у краіне заменяць электроннымі з класам дакладнасці не менш як 2 (а гэта каля 3,5 млн лічыльнікаў). Пазней усе яны будуць аб'яднаны ў аўтаматызаваную сістэму кантролю і ўліку электраэнергіі. Новых прылад у краіне ўжо каля 70 %.*

## НОЧ, ВЕЧАР, ДЗЕНЬ, СЕЗОН...

Для грамадзян, якія выкарыстоўваюць электраэнергію на ацяпленне, гарачае водазабеспячэнне і гатаванне ежы, прадугледжаны тры тарыфныя групы. Калі сумарная магутнасць электранагравальнага абсталявання большая за 5 кВт, то ў перыяд мінімальных нагрузак (з 23:00 да 6:00) электрычнасць каштуе 12,2 капейкі за 1 кВт/г, у астатні час — 22,66 капейкі за 1 кВт/г.

Калі жыллё не абсталявана сістэмай цэнтралізаванага цеплазабеспячэння, ацяплення і гарачага водазабеспячэння, а таксама сістэмай цэнтралізаванага газазабеспячэння, то з 1 чэрвеня да 31 снежня 1 кВт/г абыдзецца ў 3,98 капейкі. Пры гэтым у жыллі могуць знаходзіцца падключаныя да дадатковай прылады індывідуальнага ўліку расходу электраэнергіі (без выкарыстання штэпсельных злучэнняў) стацыянарныя прыёмнікі электраэнергіі (электракатлы, канвектары, цеплапомпы, цёплыя падлогі).

Тыя, хто не хоча ставіць дадатковую асобную прыладу ўліку, могуць разлічвацца ў гэты час (з 1 чэрвеня да 31 снежня) па аднаставачным тарыфе — 9,09 капейкі за 1 кВт/г або дыферэнцыяваным — 6,36 капейкі (з 23:00 да 6:00) і 11,82 капейкі (у астатні час), дадаў прадстаўнік «Белэнерга».

*— З 1 ліпеня 2019 года прадугледжана дыферэнцыраванне па трох часавых перыядах. З 23:00 да 6:00 электрычнасць каштуе 12,55 капейкі за 1 кВт/г, у час максімальнай нагрузкі (17:00 — 23:00) — 37,66 капейкі; у астатні час сутак — 14,64 капейкі за 1 кВт/г. Аднаставачны тарыф у кватэрах, якія не абсталяваны электраплітамі, — 20,92 капейкі, так што гэтыя тарыфы стымуляцыйныя.*

Нагадаем, што грамадзяне, якія жывуць у дамах, дзе ніхто не прапісаны, плацяць за электрычнасць па эканамічна абгрунтаваных тарыфах — 23 капейкі за 1 кВт/г. І гэты тарыф не зменшыцца, нават калі такія дамы абсталяваць электраўстаноўкамі. Права на зменшаную маюць людзі, якія дасягнулі пенсійнага ўзросту і зарэгістраваны па месцы знаходжання або інваліды ІІ і ІІІ групы. А план па замене ўсіх зношаных электрасетак у краіне — справа, вядома, не адной пяцігодкі.

**Матэрыялы падрыхтавала Ірыны СІДАРОК.**

Кожны трэці

# У ЖНІЎНІ СОРАК ПЕРШАГА...

**У жніўні 1941-га Лунінец літаральна здрыгануўся ад акта масавага тэрору, які быў першым, але не апошнім на працягу трох гадоў панавання гітлераўцаў і іх памагатых у нашым раёне...**

Як вядома, Генеральная пракуратура краіны распачала крымінальную справу па факце генацыду беларускага народа ў гады нямецка-фашысцкай акупацыі. Следчая група стала вывучаць архіўныя дакументы і крымінальныя справы ў дачыненні да нацысцкіх злачынцаў і іх памагатых, весці пошук жывых сведак, якія маглі б падзяліцца сваімі ўспамінамі. Пра гэта расказаў **пракурор Лунінецкага раёна Юрый ПРАКАПЧУК:**

— Была арганізавана работа па ўстанаўленні невядомых раней месцаў масавага знішчэння мірных жыхароў. У пракуратуру сталі звяртацца неабыякавыя землякі. Паступіла паведамленне пра ахвяр фашызму, пахаваных паблізу вёсак Галы Бор і Добрая Воля. Сведкі паказалі меркаваныя месцы расстрэлаў вяскоўцаў у перыяд 1941—1944 гадоў.

Юрый Іванавіч адзначыў, што зварот, які датычыўся самага масавага знішчэння ў Лунінцы, быў заснаваны на ўспамінах аднаго з ураджэнцаў горада. Пасля падзей верасня 1939 года Сандамір Абрамавіч Эльпінер стаў загадчыкам друкарні, выпускаў першы нумар раённай газеты. У маі 1940-га яго прызвалі ў Чырвоную Армію. З першага дня Вялікай Айчыннай быў на фронце, тройчы паранены. Гвардыі старшы сяржант, камандзір аддзялення сувязі 50-га гвардзейскага стралковага палка 24-й гвардзейскай стралковай дывізіі быў узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі «За адвагу» (тройчы), «За абарону Сталінграда», «За ўзяцце Кёнігсберга», «За перамогу над Германіяй у Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945 гг.». Вярнуўшыся дадому, удзельнік вайны даведаўся, што ўся яго сям'я знішчана фашыстамі... Праз год пасля Вялікай Перамогі ажаніўся з такой жа сіратой, якая ўратавалася ў эвакуацыі, — усе родныя яе загінулі ад рук акупантаў... У Лунінцы нарадзіліся дзве іх дачкі, а ў сярэдзіне 1950-х сям'я рэпатрыіравалася ў Ізраіль. З-за палітычных рознагалоссяў паміж СССР і Ізраілем наш зямляк змог наведаць малую радзіму толькі ў 1991 годзе. Праз 50 гадоў інфармацыя пра расстрэл мужчын-яўрэяў у жніўні 1941-га ўпершыню стала вядома лунінецкай грамадскасці...

Пракурор падкрэсліў, што пацвярджэнне гэтых звестак маецца ў акце Лунінецкай раённай камісіі садзейнічання ў рабоце Надзвычайнай дзяржаўнай камісіі па расследаванні і ўстанаўленні злачынстваў нямецка-фашысцкіх захопнікаў і іх памагатых на часова акупаванай тэрыторыі раёна ад 10 красавіка 1945 года. З гэтага дакумента, напрыклад, вынікае:

«У ваколіцах г. Лунінца камісія даследавала магілы масавых ахвяр фашысцкага тэрору... Ва ўрочышчы «Мачула» выяўлены сем магіл, размешчаных за 400 метраў на поўнач ад сеннай базы пры насыпе чыгуначнай веткі Лунінец — Пінск. Памер кожнай з трох невялікіх магіл: 6х2,5 метра; памер кожнай з чатырох меншых магіл: 4х1,5 метра. У гэтых сямі магілах пахаваны 1312 чалавек мужчын...»

У пасляваенны час былі апытаны і сведкі трагедыі: Жук Уладзімір Сцяпанавіч, Аляшкевіч Пракоп Акімавіч ды іншыя мясцовыя жыхары. На падставе іх паказанняў было ўстаноўлена наступнае — зноў працытуем дакумент:

«...У пачатку жніўня 1941 г. па заданні мясцовых органаў «СД» гарадская ўправа Лунінца абвясціла збор мужчын-яўрэяў пад выглядам праверкі дакументаў і ўстанаўлення спецыяльнасцяў. Акрамя дакументаў, ім было загадана ўзяць з сабой рыдлёўкі, сякеры і пілы, быццам бы іх адпраўяць на працу пасля праверкі дакументаў. Тых, хто сабраўся, пад канвоем нямецкай жандармерыі павялі ва ўрочышча «Мачула», загадзя ачэпленае немцамі. Тут частку прыведзеных прымусілі выкапаць ямы. Перад кожнай ямай па дзесяць чалавек прымушалі класціся на зямлю тварам уніз. Тых, хто ляжаў, нямецкія каты расстрэльвалі ва ўпор у патыліцу, а тых, хто застаўся жывы, прымушалі скідаць забітых у ямы і самім класціся на іх месца. Тых, хто супраціўляўся, расстрэльвалі на месцы...»

Урыўкі з гэтага акта апублікаваны ў гісторыка-дакументальнай хроніцы «Памяць. Лунінецкі раён» (1995). Праз некалькі гадоў у раённай газеце сваімі ўспамінамі аб трагедыі падзяліўся Леў Леанідавіч Коласаў. Вядомы краязнаўца пісаў:



«...У гэтай першай групе расстраляных лунінецкіх яўрэяў былі галоўны рабін горада Юдэль Іегуда Зулер, урач Гурвіч, камунальнік Іцка Муляр, узнагароджаны бронзавым медалём за заслугі перад Лунінцам (бацька вядомага ў горадзе футбаліста), і шматшмат іншых. А вось прозвішчы варшаўскіх бежанцаў сёння вызначыць ужо немагчыма...

Пакуль за горадам расстрэльвалі яўрэяў, у самім Лунінцы ўмела была арганізавана аблава на тых, хто не з'явіўся да ўправы. Паліцаі і нямецкія салдаты не прапусцілі ніводнага двара, саду і агарода, ніводнай вуліцы і завулка. На жаль, фашыстам дапамагалі не толькі лунінчане-паліцаі, але і асобныя добраахвотныя старанныя памочнікі з грамадзянскіх асоб. На Чырвонай вуліцы «вызначыліся» двое маладых братоў, якія з палкамі ў руках шукалі ахвяр па агародах. Аблава дала свае вынікі — было злоўлена каля 40—50 мужчын, якіх таксама расстралялі за горадам...

Першае масавае пакаранне людзей выклікала ў горадзе шок. Лунінец прыціх, скурчыўся. Асабліва ўражанне зрабіў расповед паліцэйскіх, як Якаў Грыніштэйн на каленях, плачучы, маліў аднаго з іх аб літасці, а яго збівалі палкамі і потым расстралялі... А што рабілася ў сем'ях забітых! У дамах усюды чуліся рыданні, малення аб дапамозе. Прыгадваць пра гэта страшна...».

Прадстаўнікі Таварыства выхадцаў з Лунінца і Кажан-Гарадка ў Ізраілі, якія з 1990-х гг. штогод наведваюць Беларусь, планавалі ўсталяваць памятны знак на пахаванні мужчын-яўрэяў, але не змаглі знайсці дакладнае месца знішчэння. Самыя дасведчаныя жыхары сцвярджалі, нібыта зараз там размешчаны гаражны масіў. Не так даўно ключ да пошуку дала лунінчанка Надзея Іванаўна Карпуковіч. Яна нарадзілася ў пасляваенны час, але менавіта на вуліцы Пясчаная, дзе была размешчана вышэйпрыгаданая сенная база. Так было ўстаноўлена меркаванае месца пахавання 1312 ахвяр фашызму.

Сабраныя матэрыялы перададзены ў Генеральную пракуратуру, якая і прыме рашэнне аб наступных дзеяннях. Раённы пракурор заклікаў мясцовых жыхароў працягваць дзяліцца інфармацыяй пра невядомыя месцы масавых пахаванняў перыяду нямецка-фашысцкай акупацыі. Каб не дапусціць падобных злачынстваў на нашай мірнай зямлі, неабходна ўвекавечанне памяці аб усіх ахвярах фашызму.

Днямі прадстаўнікі грамадскасці ўсклалі традыцыйныя 6 руж (гэта лічба азначае 6 мільёнаў ахвяр Халакосту) да брацкай магілы вязняў гета — у памяць аб 80-й гадавіне гібелі 1312 лунінецкіх мужчын-яўрэяў.

**Таццяна КАНАПАЦКАЯ.**

Ніхто не забыты

# «ПАМЯЦЬ І СЛАВА»: ЗНАЙСЦІ І АДНАВІЦЬ

100 БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ

**Супрацоўнікі і студэнты гістарычнага факультэта БДУ на Маскоўскіх і Чыжоўскіх могілках у Мінску высветлілі месцазнаходжанне і прывялі ў парадак надмагіллі 18 дзеячаў навукі і адукацыі, якія ў розныя гады працавалі ў БДУ.**

Сярод іх — дэкан гістарычнага факультэта БДУ ў 1955—1973 гадах Пётр Савачкін, беларускія літаратуразнаўцы Любоў Фігloўская і Аза-Арыядна Багрова, філосафы Барыс Лапатко і Васіль Сцяпанаў, савецкі перакладчык Сямён Дорскі, юрысты Навамір Кудзінаў, Яўген Семярыхін і Арон Фарфель, філолаг Варвара Крыўчык, фізікі Мікалай Кунін, Рыгор Міхайлаў, Уладзімір Лаўрыковіч, гісторыкі Фёдар Мухін і Аляксандр Вашкевіч, савецкі беларускі гісторык-германіст Рыгор Трухноў, археограф і празаік Мікалай Улашчык, хімік Мікалай Ярмоленка.

Работа па пошуку і добраўпарадкаванні пахаванняў выкладчыкаў і навукоўцаў БДУ вядзецца з 2020 года ў рамках праекта «Памяць і слава». Валанцёры гістарычнага факультэта займаюцца пошукам пахаванняў на сталічных Вайсковых, Маскоўскіх, Кальварыйскіх і Чыжоўскіх могілках шляхам вывучэння біяграфічных звестак дзеячаў ВНУ з іх асабістых спраў і дакументаў у архіве БДУ і Нацыянальным архіве Беларусі. Таксама гісторыкі распачалі работу па стварэнні агульнаўніверсітэцкай базы даных супрацоўнікаў, чые надмагіллі маюць патрэбу ў добраўпарадкаванні. Сёння ў адкрытым спісе значацца ўжо 44 адноўленыя пахаванні, сярод якіх пахаванне Героя Савецкага Саюза Уладзіміра Каргузалава.



Акрамя таго, валанцёры ўстанавілі спіс выпускнікоў БДУ 1941 года і звяраюць яго з базамі даных удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны для дапаўнення ўніверсітэцкага спіса студэнтаў-герояў.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**


РЕЗУЛЬТАТЫ ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ

**«ИГРАЙТЕ НА ВСЁ»**

Организатором рекламной игры «Играйте на ВСЁ» является ООО «ТДИ ПРОМОИВЕНТ», Республика Беларусь, 220034, г. Минск, ул. Краснозвёздная, 18б, к. 25, пом. 701, УНП 190771520.

Телефон для справок по вопросам проведения рекламной игры «Играйте на ВСЁ»: +375173887686 с 9:00 до 21:00 без выходных, сайт igra.belveb.by.

Наименование рекламной игры: «Играйте на ВСЁ».

Территория проведения: Республика Беларусь.

Период проведения: с 1 апреля 2021 г. по 23 августа 2021 г.

В рекламной игре приняли участие 34 778 участников.

Призовой фонд игры разыгран полностью.

Обладателями 9 (девяти) призов «Робот-пылесос Xiaomi Robot Vacuum-Mop P SKV4110GL (белый) и денежные средства в размере 126,86 (сто двадцать шесть белорусских рублей 86 копеек)» стали:

Жилич Сергей Георгиевич, Зеленко Андрей Станиславович, Хай Аскольд Владимирович, Кашицкий Павел Владимирович, Волкова Алеся Владимировна, Цыбулько Сергей Сергеевич, Жданович Инна Анатольевна, Шенец Павел Павлович, Полыко Наталия Константиновна.

Обладателями 9 (девяти) призов «Электросамокат Hoverbot MV-02 / HVBTMV2 и денежные средства в размере 141,81 (сто сорок один белорусский рубль 81 копейка)» стали:

Полубинская Ольга Викторовна, Чудакова Марина Викторовна, Корней Ирина Юрьевна, Назаров Андрей Владимирович, Савченко Сергей Константинович, Евмененко Валентина Васильевна, Гончарик Мария Станиславовна, Самойленко Алеся Анатольевна, Ладырида Сергей Иванович.

Обладателями 9 (девяти) призов «Смартфон Apple iPhone 12 Mini 128GB / MGE63 (синий) и денежные средства в размере 409,43 (четыреста девять белорусских рублей 43 копейки)» стали:

Лыско Галина Михайловна, Бункевич Анатолий Чеславович, Головач Александр Сергеевич, Кантария Гиорги, Богач Мария Аркадьевна, Полховский Владимир Леонидович, Метлицкий Иван Георгиевич, Куприян Артём Вячеславович, Бекарев Антон Сергеевич.

Обладателем приза «Автомобиль Geely COOLRAY (SX11), Хэтчбек, Flagship (Dual), 1.5, HP, Бензин, 4x2, АКПП7, Y4K8622Z3MB900784, Оранжевая свобода; Мультимедиа акустика Nakatomi OS-74 (коричневый); Ультразвуковой увлажнитель воздуха Electrolux EHU-3710D; Пылесос Samsung VCC4180V36/XEV; Кофемашина DeLonghi Magnifica S Smart ECAM 250.23 SB; Настольная лампа Xiaomi Mi LED Desk Lamp 1S MUE4105GL / MJTD01SYL; Вафельница Clatronic WA 3492 (Black); Телевизор Samsung UE43TU8000UXRU; Электрогриль FIRST Austria FA-5344-3 и денежные средства в размере 8 651,43 (восемь тысяч шестьсот пятьдесят один белорусский рубль 43 копейки)» стала Ващилко Екатерина Игоревна.

Свидетельство о государственной регистрации рекламной игры «Играйте на ВСЁ» № 3962 от 25.03.2021 г., выданное Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь.

Правила рекламной игры «Играйте на ВСЁ» опубликованы в газете «Звязда» № 59 от 31.03.2021 г.

# Краіна здароўя

Вядучая рубрыкі Алена КРАВЕЦ.
Тэл. (017) 311-17-36.

# Не марнаваць час!

## У якіх выпадках трэба тэрмінова весці дзіця да стаматолага?

**Першы агляд малога ўрачом-стаматолагам адбываецца яшчэ на першым тыдні жыцця, у радзільным доме. Ён глядзіць, ці правільна ў дзіцяці сфарміравана паднябенне, ці ўсё ў парадку са слізістай і вуздэчкай языка. У наступны раз дзіця трэба паказаць стаматолагу пры з'яўленні першых зубоў. Урач ацэніць гігіену поласці рота, стан эмалі і дасць рэкамендацыі па доглядзе за зубамі. І далей прафілактычныя візіты да стаматолага павінны быць штогадовымі. Аднак бываюць сітуацыі, калі зварот да ўрача адкладваць нельга. Пра іх расказала фельчар-валеолаг 3-й гарадской дзіцячай клінічнай паліклінікі Ірына БРЫТВІЧ.**



### Карыес

Нават калі зубы малочныя, не трэба сябе пераконваць, што яны «хутка самі выпадуць». Памятайце, што інфекцыя можа перадацца да пастаяннага зуба, які расце ўнутры, у такім выпадку лячыць яго будзе больш складана. Зубная дзіцячая эмаль танчэйшая, чым у дарослага, і карыес распаўсюджваецца вельмі хутка, таму марнаваць час нельга.

### Пульпіт

Калі бацькі «празявалі» карыес на пачатковай стадыі, то ў дзіцяці можа развіцца захворванне мяккіх тканак зуба, што прыводзіць да моцных балючых рэакцый. Гэта ўжо экстранная сітуацыя, якая патрабуе тэрміновага звароту да ўрача, нават да кругласутачных стаматалагічных службаў.

### Стаматыт

Яшчэ адно непрыемнае захворванне ў ротавай поласці, якое нярэдка сустракаецца ў дзяцей. Яно выяўляецца ў выглядзе язвачак на слізістых абалонках і носіць інфекцыйны характар. Тут зноў-такі вам спатрэбіцца дзіцячы стаматолаг.

### Няправільны прыкус

Парушэнне адноснага становішча зубоў пры самкнёных сківіцах — вельмі распаўсюджаная з'ява ў дзяцей. Пры гэтым дадзеная праблема не толькі эстэтычная, але і функцыянальная. З-за змянення зубнога раду разбураюцца здаровыя структуры і тут нават магчымыя болевыя адчуванні, якія «аддаюць» у горла і вушы. Звычайна парушэнні прыкусу ўрач лёгка можа вызначыць пры чарговым прафілактычным аглядзе (калі іх не прапускаць), пасля чаго ён дасць накіраванне да артадонта.

Што на талерцы?

# КАБ ПРЫХОД АДПАВЯДАЎ РАСХОДУ,

## або Асаблівасці харчавання пажылых людзей

**У арганізме пасля 50—60 гадоў адбываюцца фізіялагічныя змены: запавольваецца абмен рэчываў, слабее перыстальтыка кішэчніка. Горш засвойваюцца карысныя рэчывы, інакш расходуецца энергія, запавольваюцца абменныя працэсы. Таму пажылым людзям неабходна перагледзець свой рацыён, каб адчуваць сябе камфортна. Урач-валеолаг Гарадскога клінічнага псіхіятрычнага дыспансера Леанід МЯЛЕШКА распавёў пра тое, як трэба харчавацца з улікам гэтых асаблівасцяў.**

— Сучасная навука аб рацыянальным харчаванні пажылых людзей — герадыетыка — узнікла невыпадкова. У арганізме сталага чалавека адбываюцца функцыянальныя і марфалагічныя змены, якія адбіваюцца на зніжэнні функцыі стрававальнай сістэмы. Зніжаецца вылучэнне стрававальных сокаў, змяншаецца, а затым зніжае кіслотнасць страўнікавага соку. Запавольваецца рухальная функцыя кішэчніка, з'яўляецца схільнасць да запораў. Памяншаецца ўтварэнне ў падстраўнікавай залозе інсуліну, у крыві назапашваецца залішняя колькасць халестэрыну, які адкладваецца на сценках сасудаў і прыводзіць да развіцця атэрасклерозу, — кажа ўрач.

Трэба сказаць, што герадыетыка не забараняе ўжыванне любых прадуктаў. Аднак варта памятаць аб прынцыпах рацыянальнага харчавання.

— Найперш, яно павінна быць энергетычна збалансаванае, гэта значыць неабходна, каб калорыі, якія паступаюць з ежай, адпавядалі іх расходу. Нездарма ў старажытным Рыме на магіле чалавека, які пражыў 112 гадоў, быў надпіс: «Ён еў і піў у меру», — нагадвае доктар.

Антысклератычная накіраванасць рацыёну дасягаецца зніжэннем ужывання жывёльных тлушчаў і прадуктаў з павышаным утрыманнем халестэрыну (сметанковае масла, свініна, каўбаса, субпрадукты, яйкі, свіны тлушч) і ўжываннем большай колькасці раслінных алеяў (сланечнікавага, аліўкавага, ільнянога, соевага і іншага). Неабходна павялічваць ужыванне тварагу — да 100 грамаў, кісламалочных і морапрадуктаў — да 300 грамаў у дзень.



— Выкарыстоўвайце харчовыя прадукты, якія вызначаюцца лёгкай засваяльнасцю. Перавагу аддавайце рыбным і малочным стравам, а не мясным. Пажылым людзям рэкамендуецца да 100 грамаў на дзень нятлустага мяса (ялавічыны) і 75 грамаў рыбы. Аптымальнай кулінарнай апрацоўкай з'яўляюцца варэнне і тушэнне, бо пры смажанні ў алеі ўтвараюцца шкодныя для здароўя рэчывы. Штодзённая патрэба ў хлебабулачных прадуктах складае 300 грамаў, перавагу лепш аддаваць хлебу з мукі грубага памолу, — нагадвае Леанід Мялешка.

Звярніце ўвагу на дастатковае ўтрыманне ў рацыёне вітамінаў і мінералаў. Больш ужывайце гародніны, садавіны, свежавыціснутых сокаў. У свежай капусце змяшчаецца вітамін, які аказвае супрацьсклератычнае дзеянне. Морква ўтрымлівае караціны і солі калію. Не грэбуйце цыбуляй і часнаком. Ужывайце не менш за адну дольку часнаку штодня.

А вось колькасць кухоннай солі варта абмежаваць да пяці грамаў у дзень, бо злоўжыванне ёю прыводзіць да павышэння артэрыяльнага ціску, ацёкаў і парушэння работы сэрца. Улічваючы ўзроставае зношванне інсулярнага апарату падстраўнікавай залозы, што прыводзіць да развіцця цукровага дыябету, неабходна абмежаваць ужыванне цукру да 30—40 грамаў у дзень. Патрэбу ў цукры лепш папаўняць за кошт складаных вугляводаў, якія змяшчаюцца ў гародніне, садавіне, хлебе, крупах.

Каву, шакалад, вяндліну, чорны чай, алкаголь ужывайце ў абмежаванай колькасці. Недапушчальнае пераяданне, парушэнне рэжыму харчавання. Вялікае значэнне мае размеркаванне ежы на працягу дня па аб'ёме і каларыйнасці.

— Не забывайце пра народную мудрасць: «Сняданак з'еш сам, абед раздзялі з сябрам, вячэру аддай ворагу». Ранішняя ежа павінна ўтрымліваць 35—40 % дзённага рацыёну, абед — 40—45 %, вячэра — 15 %. Пераяданне на ноч парушае рытм работы страўнікава-кішачнага тракта, пагаршае адпачынак стрававальнай сістэмы, прыводзіць да парушэння сну, — кажа ўрач.

Пры гэтым ён адзначае, што харчаванне пажылога чалавека не павінна кардынальна адрознівацца ад харчавання людзей іншага ўзросту. Але, улічваючы ўзроставыя змены, усё ж варта крыху перагледзець свае звычкі ў ежы.

Скажыце, доктар...

# ЖАНОЧАЯ ДОЛЯ

## Як папярэдзіць гінекалагічныя хваробы?



**Як вядома, адным з найважнейшых складнікаў фізічнага стану жанчыны з'яўляецца рэпрадуктыўнае здароўе, якому варта аддаваць неабходную ўвагу. Многія гінекалагічныя праблемы нагадваюць пра сябе адразу, але мы не заўсёды звяртаем на іх увагу і не спяшаемся да доктара. На якія сімптомы трэба зважаць і пра што яны могуць сведчыць, расказала ўрач-акушэр-гінеколаг 1-й катэгорыі 11-й гарадской паліклінікі Мінска, аспірант кафедры рэпрадуктыўнага здароўя і медыцынскай генетыкі БелМАПА Святлана КРЭЕР.**

### ПРЭЧ ЗАПАЛЕННЕ!

***— Святлана Аляксандраўна, назавіце асноўныя жаночыя хваробы?***

— Іх можна падзяліць на некалькі груп. Найперш гэта запаленчыя захворванні — кальпіт, цэрвіцыт, эндаметрыт, аднэксіт. Далей можна вылучыць дабраякасныя наватўтварэнні — мастапатыя, міёма, эндаметрыёз, кісты яечнікаў і іншае. Злаякасныя пухлінныя захворванні — рак цела маткі, рак шыйкі маткі, малочнай залозы, рак яечнікаў. Можна вылучыць групу эндакрынных захворванняў, гэта гіперандрагенія (калі ў жанчыны сінтэзуецца шмат мужчынскіх палавых гармонаў), гарманальныя дысфункцыі, аменарэя (адсутнасць месячных на працягу некалькіх цыклаў). Асобна стаіць бясплоднасць.

***— Што становіцца прычынай запаленчых хвароб? Як яны праяўляюцца?***

— Сімптомамі кальпіту, цэрвіцыту, эндаметрыту, аднэксіту з'яўляюцца непрыемныя выдзяленні, боль і цяжар унізе жывата, павышэнне тэмпературы цела (у залежнасці ад ступені выяўленасці запаленчага працэсу), болі пры мочаспусканні і палавым акце. А прычыны могуць быць розныя: кішэчная палачка, стафілакок, стрэптакок, энтэрабактэрыі, хламідыі, мікаплазмы, вірус простага герпесу (2-і тып), вірус папіломы чалавека, ганарэя. Трэба звяртацца да гінеколага, які прызначыць неабходныя аналізы і лячэнне.

***— Апошнім часам шмат кажуць пра вірус папіломы чалавека. Чым ён небяспечны? Як яго выявіць?***

— Ён з'яўляецца прычынай перадракавых захворванняў шыйкі маткі (дысплазіі 1, 2, 3 ступеняў), раку шыйкі маткі. Дыягнаставаць яго лепш за ўсё метадамі вадкаснай цыталогіі, ПАП-тэста, кальпаскапіі, ПЛР-тэста на вірус папіломы чалавека высокай канцэрагеннай рызыкі. Але важна яго не блытаць з папіломамі скуры, слізістай шыйкі маткі, гэта вірус папіломы чалавека 6 і 11 тыпаў, яны дабраякасныя.

### ДАБРАЯКАСНЫЯ, АЛЕ НЕПРЫЕМНЫЯ

***— Як праяўляе сябе міёма маткі?***

— Болем унізе жывата і пры палавым акце, ускладненымі мочаспусканнем, актам дэфекацыі, крывацёкамі ў міжменструальны перыяд, інтэнсіўнымі месячнымі са згусткамі, працяглымі месячнымі, павелічэннем у памерах жывата. Міёма патрабуе дакладнай дыягностыкі, лячэння і назірання ва ўрача. Таму пры наяўнасці сімптомаў варта звяртацца да гінеколага.

***— Яшчэ адным распаўсюджаным новаўтварэннем з'яўляюцца кісты яечнікаў. Як іх пазбегнуць?***

— Для прафілактыкі ўтварэння кістаў яечнікаў неабходна ведаць прычыны іх узнікнення. А гэта гарманальныя парушэнні, запаленчыя захворванні органаў малога таза. Таксама рызыку ўзнікнення кістаў яечнікаў павялічваюць эндакрынныя паталогіі, напрыклад, збоі ў рабоце шчытападобнай залозы, нерэгулярны менструальны цыкл, атлусценне, прыём гарманальных прэпаратаў (для кантрацэпцыі або пры падрыхтоўцы да ЭКА), хранічныя запаленчыя захворванні мачавога пузыра і кішэчніка, курэнне, абορты, некаторыя лекавыя прэпараты, прызначаныя пры злаякасных пухлінах малочных залоз, прыроджаныя анамаліі развіцця тканак, занадта ранні пачатак менструацыі (да 11 гадоў), стрэсы, аперацыі на органах палавой сістэмы.

### САМАЕ СТРАШНАЕ

***— Якія сімптомы могуць указваць на рак малочнай залозы?***

— Пухліна ў малочнай залозе, выдзяленні з саскоў (крывяністыя, светлыя), скура па тыпе «цытрынавай скарынкі», ацёк саскоў і іх уцягванне, змены ў памерах, форме малочных залоз, эрозіі і пачырванене на скуры малочных залоз. Трэба адзначыць, што для выяўлення праблем з малочнымі залозамі самаабследавання недастаткова. Жанчыны павінны праходзіць інструментальныя абследаванні: ва ўзросце ад 18 да 49 гадоў УГД малочных залоз пажадана на 9-10 дзень менструальнага цыклу, у 50—70 гадоў — мамаграфію. Яна выконваецца адзін раз на два гады.

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА
### по продаже недвижимого имущества, находящегося в собственности ОАО «Жеребковичи

| Наименование недвижимого имущества | Местонахождение недвижимого имущества | Сведения о недвижимом имуществе |
|---|---|---|
| **Здание сельского дома культуры** | **Брестская область, Ляховичский р-н, д. Своятичи, ул. Орловского, 57** | Здание 2-эт., кирпичное, 1974 г.п, площадь – 1099,9 кв. м, один бетонный подвальный этаж. Земельный участок площадью 0,1345 га, целевое назначение – для обслуживания сельского дома культуры, ограничения в использовании земельного участка в связи с его расположением в охранной зоне линии электропередачи напряжением до 1000 вольт на площади 0,0030 га |

**Продавец недвижимого имущества –** ОАО «Жеребковичи» Ляховичского района Брестской области, тел.: 8 016 33 4 52 23; 4 52 44.
Электронный адрес: www.gerebkovichi@tut.by.
**Начальная цена предмета торгов – 1 базовая величина.**
**Размер задатка – 1 базовая величина.**
**Реквизиты счета для перечисления задатка:**
р/с BY76BAPB30124500800110000000 ЦБУ № 135 г. Ляховичи Региональная дирекция по Брестской области ОАО «Белагропромбанк», БИК BAPBBY2X, УНН 200058414, ОКПО 03802510, получатель платежа – ОАО «Жеребковичи», срок внесения суммы задатка – до подачи заявления на участие в аукционе.
Окончание приема заявлений на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами 30 августа 2021 г. в 15.00.
Шаг аукциона: 5 % от начальный цены предмета аукциона

**Организатор аукциона –** ОАО «Жеребковичи» Ляховичского района Брестской области, тел. 801633 4 52 23; 4 52 44

Повторный аукцион назначен на **31 августа 2021 года** в 11.00 по адресу: Брестская область, Ляховичский район, аг. Жеребковичи, ул. Минская, 6а (административное здание ОАО «Жеребковичи»).

**Обязательства покупателя выполнения следующих условий при заключении договора купли-продажи**

**Вариант 1:**

осуществление предпринимательской деятельности[1] с использованием приобретенного объекта и (или) построенного нового после его сноса в течение трех лет, начиная:

не позднее двух лет с даты подписания акта приема-передачи приобретенного объекта;

в случае использования права сноса приобретенного объекта и строительства нового объекта – не позднее пяти лет с даты подписания акта приема-передачи приобретенного объекта. В целях использования данного права не позднее двух месяцев с даты подписания акта приема-передачи приобретенного объекта обратиться с заявлением в Ляховичский районный исполнительный комитет для получения разрешительной документации на снос, а также на проектирование и строительство нового объекта (при необходимости). Осуществить снос и строительство в порядке и в сроки, определенные разрешительной (проектной) документацией.

**Вариант 2:**

- при реконструкции под жилые помещения, или переводе в жилое помещение без реконструкции:

• не позднее двух месяцев с даты подписания акта приема-передачи приобретенного объекта обратиться с заявлением в Ляховичский районный исполнительный комитет для принятия решения о переводе приобретенного объекта в жилое помещение; в случае если в решении о переводе в жилое помещение не указано о необходимости проведения реконструкции, в течение трех месяцев с даты принятия решения о переводе в жилое помещение осуществить изготовление технического паспорта и государственную регистрацию изменения назначения объекта (в том числе изменения назначения земельного участка); при необходимости проведения реконструкции в соответствии с принятым решением о переводе в жилое помещение:

• не позднее одного месяца с даты принятия решения о переводе в жилое помещение обратиться с заявлением в Жеребковичский сельский исполнительный комитет для получения разрешительной документации (разрешения) на реконструкцию; в срок, не превышающий одного года с даты получения разрешительной документации (решение сельисполкома), разработать и согласовать в установленном законодательством порядке проектную документацию, содержащую нормативные сроки реконструкции приобретенного объекта; осуществить реконструкцию и ввод приобретенного объекта в эксплуатацию в нормативные сроки, определенные проектной документацией; в течение трех месяцев с даты ввода в эксплуатацию жилого помещения осуществить изготовление технического паспорта и государственную регистрацию изменения назначения объекта (в том числе изменения назначения земельного участка); общий срок выполнения обязательств в случае необходимости проведения реконструкции приобретенного объекта (включая государственную регистрацию изменения назначения объекта, в том числе изменения назначения земельного участка) не должен превышать пяти лет с даты подписания акта приема-передачи приобретенного объекта;

- при приобретении объекта для ведения личного подсобного хозяйства использовать его для ведения личного подсобного хозяйства в течение трех лет, начиная не позднее трех лет с даты подписания акта приема-передачи приобретенного объекта;

- покупатель имеет право сноса отдельных объектов, которые не могут быть использованы при реконструкции под жилые помещения или переводе в жилое помещение без реконструкции, или для ведения личного подсобного хозяйства. В случае использования права сноса осуществить такой снос в порядке и сроки, определенные разрешительной (проектной) документацией, но не позднее предельных сроков, установленных для основных условий.

**Вариант 3:**

не позднее двух месяцев с даты подписания акта приема-передачи приобретенного объекта обратиться с заявлением в Ляховичский районный исполнительный комитет для получения разрешительной документации на его снос и определения целевого назначения земельного участка. Снос осуществить в порядке и в сроки, определенные разрешительной (проектной) документацией;

3.2. запрещение отчуждения, передачи без перехода права собственности, залога приобретенного объекта (построенного нового, реконструированного) до выполнения покупателем условий договора купли-продажи, за исключением случаев его отчуждения, передачи без перехода права собственности юридическому лицу, собственником имущества, учредителем (участником) которого является покупатель, и принявшему на себя все обязательства и ответственность путем заключения дополнительного соглашения о внесении соответствующих изменений в договор купли-продажи.

Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан в течение 10 рабочих дней с даты проведения аукцион:

- возместить затраты на организацию и проведение аукциона. Информация о размере затрат доводится до сведения участников перед началом аукциона;

- выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, которые подлежат выполнению до обращения за государственной регистрацией в отношении земельного участка. После совершения победителем торгов (претендентом на покупку) названных действий, и представления продавцу и в местный исполнительный комитет копий платежных документов, но не позднее двух рабочих дней, с победителем торгов (претендентом на покупку) в установленном порядке в соответствии с условиями торгов, продавцом заключается договор купли-продажи недвижимого имущества, а в местным исполнительном комитете – договор аренды земельного участка.

Лицом, приравненным к победителю аукциона, считается единственный участник аукциона, давший согласие на покупку предмета аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %.

*[1] Под предпринимательской деятельностью понимается в том числе деятельность по оказанию услуг в сфере агроэкотуризма, ремесленная деятельность либо деятельность, при осуществлении которой физические лица, не осуществляющие предпринимательскую деятельность, уплачивают единый налог.*

## ДУКОРСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ ПУХОВИЧСКОГО РАЙОНА МИНСКОЙ ОБЛАСТИ

### 21 сентября 2021 года в 15.00 в здании Дукорского сельского исполнительного комитета, расположенного по адресу: аг. Дукора, ул. Речная, д. 14 Пуховичского района Минской области, проводит открытый аукцион по продаже гражданам Республики Беларусь земельных участков для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов

| Адрес земельного участка, кадастровый номер | Площадь земельного участка (га) | Наличие инженерных сетей | Наличие ограничений | Расходы по подготовке документации (рублей) | Начальная цена (рублей) | Задаток (рублей) |
|---|---|---|---|---|---|---|
| **Лот № 1** аг. Дукора, пер. Трудовой, 11, 624483402101001674 | 0,1476 | Сети электроснабжения, газоснабжения, водоснабжения | | 1455,92 + расходы за объявление в СМИ | 13535,00 | 1353,5 |
| **Лот № 2** д. Подлипки, 2, 624483405101000095 | 0,1194 | Сети газоснабжения | Охранная зона объектов газораспределительной системы площадью 0,0098 га | 1467,97 + расходы за объявление в СМИ | 4096,00 | 409,6 |
| **Лот № 3** дер. Веселое, д. 3, 624483001101000059 | 0,1474 | Сети электроснабжения, газоснабжения, водоснабжения | | 130,00 + расходы за объявление в СМИ | 3700,00 | 370,0 |

Желающим участвовать в аукционе необходимо внести соответствующий размер задатка на р/с BY23AKBB36006250900060000000, УНП 600537220, код платежа 04901 (частная собственность).

Получатель: главное управление Министерства финансов Республики Беларусь по Минской области.

Банк: ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Минск, BIC AKBB BY2X.

**Участники аукциона должны представить следующие документы:**

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме.
2. Копии платежных поручений, заверенных банком, подтверждающие внесение задатка на расчетный счет продавца.
3. Физическим лицам – документ, удостоверяющий личность (паспорт) покупателя или его доверенного лица, и доверенность, заверенную нотариально в случае, если интересы покупателя представляет это лицо).
4. Заключить соглашение с местным исполнительным комитетом.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются до **17.00 15 сентября 2021 года по вышеуказанному адресу.**

Аукцион состоится по каждому лоту при наличии не менее двух участников.

Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на предоставление предмета аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан:

- в течение 10 (десяти) рабочих дней после утверждения протокола о результатах аукциона осуществить оплату за земельный участок и расходы по организации и проведению аукциона, затраты на публикацию информационного сообщения;

- в течение двух месяцев со дня утверждения протокола о результатах аукциона, либо признания аукциона несостоявшимся, обратиться за государственной регистрацией права частной собственности на земельный участок;

- получить в установленном порядке разрешение на проведение проектно-изыскательских работ, разработать и утвердить строительный проект на строительство жилого дома в срок, не превышающий два года.

Участники аукциона предварительно могут ознакомиться с земельными участками, выставленными на аукцион, путем выезда на место нахождения участка.

Затраты на строительство, в том числе проектирование объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры к земельным участкам для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов, **подлежат возмещению** в порядке, предусмотренном в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 7 февраля 2006 г. № 72 «О мерах по государственному регулированию отношений при размещении и организации строительства жилых домов, объектов инженерной, транспортной и социальной инфраструктуры».

Контактные телефоны: (801713) 63935, 99436, 99322.

Сайт Пуховичского райисполкома.

## Открытое акционерное общество «Дорожно-строительный трест № 1, г.Витебск»

(210026, г. Витебск, ул. Суворова, 16)

**сообщает о том, что 10 августа 2021 года на внеочередном общем собрании акционеров принято решение об объявлении и выплате дивидендов за первое полугодие 2021 года**

Сумма дивидендов за первое полугодие 2021 года составляет 70212,73 белорусских рублей. Размер дивидендов в расчете на одну простую (обыкновенную) акцию составляет 0,015687019 белорусских рублей.

Дивиденды юридическому лицу выплачиваются путем перечисления на текущий (расчетный) счет до 22 сентября 2021 года, физическим лицам выплачивается согласно пункту 6.2. протокола № 70 годового общего собрания акционеров от 25 марта 2021 года по итогам (результатам) 2021 года.

УНП 300000398

Центр Промышленной Оценки
• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| Организатор аукциона | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703** |
| Продавец | **ОАО «Гомельский завод пусковых двигателей имени П. К. Пономаренко», Гомельская обл., г. Гомель, ул. Барыкина, д. 150** |

**Предмет аукциона**

**Лот № 1**
**Адрес:** Гомельская обл., г. Гомель, ул. Барыкина, 150/21, 150/22, 150В, 150, 150/20

**Здание заправочной склада ГСМ** (здание неустановленного назначения), инв. № 350/С-204136, общ. пл. 35,5 кв. м. **Открытый склад металла** (сооружение специализированное складов, хранилищ), инв. № 350/С-204137, общ. пл. 3 203,7 кв. м. **Склад лакокрасок, ГСМ** (здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ), инв. № 350/С-210707, общ. пл. 186 кв. м. **Автомобильная дорога на территории** (сооружение специализированное автомобильного транспорта и автодорожного хозяйства, инв. № 350/С-209431, общ. пл. 40 кв. м. **Ангар участка нестандартного оборудования** (здание неустановленного назначения), инв. № 350/С-206388, общ. пл. 369,1 кв. м.

**Начальная цена (с НДС 20 %) – 635 184,00 бел. руб.**

**Лот № 2**
**Адрес:** Гомельская обл., г. Гомель, ул. Барыкина, 150/2-1, 150

**Производственное помещение** (производственное помещение), инв. № 350/D-298466, общ. пл. 9 108,2 кв. м. **Магазин** (здание специализированное розничной торговли), инв. № 350/С-74042, общ. пл. 162 кв. м. **Автомобильная дорога на территории** (сооружение специализированное автомобильного транспорта и автодорожного хозяйства), инв. № 350/С-209429, общ. пл. 575 кв. м. **Автомобильная дорога на территории** (сооружение специализированное автомобильного транспорта и автодорожного хозяйства), инв. № 350/С-209430, общ. пл. 187 кв. м

**Начальная цена (с НДС 20 %) – 2 754 479,76 бел. руб.**

**Лот № 3**
**Адрес:** Гомельская обл., г. Гомель, ул. Барыкина, 150/17, 150/16, 150

**Здание специализированное обрабатывающей промышленности (участок механической обработки)** (здание специализированное обрабатывающей промышленности), инв. № 350/С-167815, общ. пл. 837,1 кв. м. **Цех безрельсового транспорта** (здание специализированное транспорта), инв. № 350/С-75350, общ. пл. 569,8 кв. м. **Автомобильная дорога на территории** (сооружение специализированное автомобильного транспорта и автодорожного хозяйства), инв. № 350/С-209428, общ. пл. 93 кв. м

**Начальная цена (с НДС 20 %) – 721 372,78 бел. руб.**

**Лот № 4**
**Адрес:** Гомельская обл., г. Гомель, ул. Барыкина, 150

**Корпус опытно-промышленного производства сорбентов** (здание неустановленного назначения), инв. № 350/С-107542, общ. пл. 2311,3 кв. м. **Автостоянка № 2** (сооружение специализированное автомобильного транспорта и автодорожного хозяйства), инв. № 350/С-107541, общ. пл. 1812 кв. м. **Зарядная станция** (здание специализированное иного назначения), инв. № 350/С-56078, общ. пл. 172 кв. м. **Помещение транспортного назначения**, инв. № 350/D-182492, общ. пл. 294,9 кв. м

**Начальная цена (с НДС 20 %) – 529 065,66 бел. руб.**

**Задаток 5 % от начальной цены лота** перечисляется на р/с № BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 15 рабочих дней** после проведения аукциона. Продавец составляет и направляет договор для подписания победителю аукциона

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги» размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by. **Ответственность** участника аукциона, его **права и обязанности**, **штрафные санкции** прописаны в **соглашении** о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Данное соглашение является договором присоединения и размещается на странице лота во вкладке «Документы» по адресу www.ipmtorgi.by. Страница лота по указанному адресу содержит также информацию о типе торгов и общих правилах их проведения. Победителем аукциона признаётся участник, предложивший максимальную цену

Победитель аукциона либо единственный участник электронных торгов, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан возместить затраты на их проведение и оплатить вознаграждение организатору аукциона в размере **1 %** от цены продажи предмета аукциона в течение **3 (трех) рабочих дней** со дня проведения аукциона

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении электронных торгов опубликовано в газете «Звязда» 27.07.2021

Дата и время начала и окончания электронных торгов: **31.08.2021 с 11.00 до 13.00.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее, чем за 10 минут до окончания торгов

Заявки на участие в электронных торгах принимаются **по 27.08.2021 до 17.00** на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу www.ipmtorgi.by

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17-280-36-37; +375 44-704-92-06. E-mail: auction@cpo.by** |

## РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ» (Организатор аукциона)

извещает о проведении повторного аукциона по продаже имущества

### ОАО «Торфопредприятие Глинка» (Продавец)

**Лота № 1: магазин** с инв. № 135/С-14467, 78,2 кв. м. Адрес: Брестская обл., Столинский р-н, Радчицкий с/с, д. Колодное, ул. Заводская, 2Г. Обременение: аренда. Земельный участок: кадастровый номер 125885201601000186, площадь – 0,0465 га. Начальная цена, бел. руб., с НДС – 9 658,27 бел. руб. Задаток, бел. руб – 965,82.

**Лота № 2: материально-технический склад** с инв. № 135/С-14581, 931,2 кв. м. Адрес: Брестская обл., Столинский р-н, Радчицкий с/с, д. Колодное, ул. Заводская, 2Д. Обременение: аренда. Земельный участок: кадастровый номер 125885201601000198, площадь – 0,5664 га. Начальная цена, бел. руб., с НДС – 47 469,13. Задаток, бел. руб – 4 746,91.

**Лот № 3: административное здание** с инв. № 135/С-14469, 215,4 кв. м. Адрес: Брестская обл., Столинский р-н, Радчицкий с/с, д. Колодное, ул. Заводская, 2В. Обременение: аренда. Земельный участок: кадастровый номер 125885201601000187, площадь – 0,1267 га. Начальная цена, бел. руб., с НДС – 12 174,97. Задаток, бел. руб – 1 217,49.

Шаг аукциона – 5 %.

**Аукцион состоится 20.09.2021 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, каб. 4.**

Порядок оформления участия в аукционе, условия аукциона и полный текст извещения содержатся на сайте Организатора аукциона ino.by. Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC банка BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.

Окончание приема заявлений и задатков – **16.09.2021 в 11.00.**

**☎ Организатор аукциона:**
**220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9,**
**8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52**
**• www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

УНП 190055182

Агульны інтарэс

# ЭКАЛАГІЧНАЯ КАРТА ДЛЯ САЮЗНАЙ ДЗЯРЖАВЫ

**Па ініцыятыве Маладзёжнай палаты пры Парламенцкім сходзе Саюза Беларусі і Расіі на базе Рэспубліканскага цэнтра экалогіі і краязнаўства дэпутаты Палаты прадстаўнікоў — члены Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі абмеркавалі пытанні стварэння экалагічнай карты водных крыніц Беларусі, з вывучэннем біясферы азёраў Байкал і Нарач, экалагічнага стану розных тэрыторый Беларусі і Расіі.**

Сустрэча была арганізавана Камісіяй па пытаннях экалогіі і прыродакарыстання Маладзёжнай палаты пры Парламенцкім сходзе Саюза Беларусі і Расіі. У мерапрыемстве ўзялі ўдзел дэпутаты, прадстаўнікі профільных міністэрстваў і ведамстваў.

Распрацоўшчыкі прадставілі варыянт экалагічнай карты горада Кіраўска Магілёўскай вобласці. На ёй можна ўбачыць раёны зялёных насаджэнняў, месца знаходжання інвазійных відаў раслін, велаінфраструктуру, пункты збору адходаў. Да таго ж там паказваюцца звесткі аб ступені забруджвання паветра і іншая важная інфармацыя.

**Першы намеснік старшыні Маладзёжнай палаты пры Парламенцкім сходзе Саюза Беларусі і Расіі Аляксандр БУРДА** расказаў, што пілотны праект у хуткім часе будзе пашыраны:

— У другім паўгоддзі бягучага года плануецца распрацаваць адзіную экалагічную карту двух рэгіёнаў Саюзнай дзяржавы. Імі будуць займацца члены Маладзёжнай палаты пры Парламенцкім сходзе Саюза Беларусі і Расіі сумесна з Міністэрствам прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя і профільным навукова-даследчым інстытутам. У планах — правесці дэталёвае вывучэнне экалагічных пытанняў у Саюзнай дзяржаве і на аснове атрыманых даных стварыць лічбавую інтэрактыўную карту. Праект будзе прадстаўлены ў выглядзе мабільнай праграмы. Дзякуючы такому падыходу карысную, цікавую інфармацыю можна будзе атрымаць у любы момант.

**Намеснік старшыні Камісіі Парламенцкага сходу па сацыяльнай і маладзёжнай палітыцы, навуцы, культуры і гуманітарных пытаннях, старшыня Пастаяннай камісіі па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Людміла МАКАРЫНА-КІБАК** адзначыла, што гэты праект будзе мець вялікае прыкладное значэнне, бо экалогія — вельмі важная сфера.

— Усе тыя распрацоўкі, якімі займаецца моладзь, мы заўсёды падтрымліваем, — удакладніла парламентарый. — Асабліва калі гэта датычыцца экалогіі нашых дзяржаў. Тым больш калі мы гаворым пра водныя рэсурсы, іх ахову, аб крыніцах. Сумесныя праекты маюць вялікае значэнне для моладзі дзвюх краін. Расія і Беларусь умацоўваюць двухбаковыя сувязі па самым шырокім спектры пытанняў. Такое супрацоўніцтва варта пашыраць. Тэматычная карта, якую прадставяць маладзёжныя парламентарыі, дапаможа фарміраванню экалагічнай культуры, развіццю турызму ў Саюзнай дзяржаве.

Па словах **першага намесніка міністра прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Баляслава ПІРШТУКА,** у Беларусі апошнім часам стаў вельмі папулярны экатурызм. «Такі від адпачынку трэба развіваць больш актыўна, важна абуджаць цікавасць да падарожжаў па Беларусі і Расіі», — дадаў ён.

— Экалагічныя карты гарадоў апошнім часам становяцца найбольш актуальныя і запатрабаваныя, — расказала **начальнік галоўнага ўпраўлення экалагічнай палітыкі, міжнароднага супрацоўніцтва і навукі Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Тацццяна КАНАНЧУК.** — Перш за ўсё гэта даступнасць экалагічнай інфармацыі любога кірунку. Ужо сёння ў нашай краіне ёсць паспяховыя праекты. Напрыклад, экалагічная анлайн-карта па Оршы і Аршанскім раёне, дзе змешчана інфармацыя па ўсіх кампанентах воднага асяроддзя: атмасфернае паветра, забруджванне зямель, палігоны для збору камунальных адходаў, жывёльны і раслінны свет і іншае. У сувязі са змяненнем клімату змяняюцца і водныя аб'екты, таму своечасовае правядзенне навуковых даследаванняў сумесна з маладымі навукоўцамі, вывучэнне водных аб'ектаў на сёння вельмі важныя. Да таго ж трэба ўдзяляць вялікую ўвагу воднаму турызму, каб прыцягваць яшчэ больш турыстаў на ўнікальныя водныя аб'екты Беларусі.

Больш падрабязна праект «Экалагічная карта Саюзнай дзяржавы» будзе разгледжаны восенню на пасяджэнні Камісіі Парламенцкага Сходу па сацыяльнай і маладзёжнай палітыцы, навуцы, культуры і гуманітарных пытаннях.

**Дар'я ШЛАПАКОВА.**

# СУПЕРФУД НАШЫХ ШЫРОТ

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

Зрэшты, пакуль што рапсавы алей па прычыне шматгадовай звычкі нашага кансерватыўнага спажыўца не складае сур'ёзнай канкурэнцыі сланечнікаваму і аліўкаваму. Хутчэй ён лічыцца экзотыкай для аматараў ЗЛЖ — у адным шэрагу з ім звычайна пералічваюць алей гарчычны, соевы, ільняны і г. д. Дык ужываць яго ці не? З гэтым пытаннем я звярнулася да спецыялістаў РНПЦ харчавання НАН пасля таго, як зноў пачула пра рапсавы алей. Пра яго згадаў у размове галоўны аграном адной з паспяховых гаспадарак, распавядаючы, што ў будучым годзе СВК збіраецца павялічыць пасевы рапсу:

— Часта куплю дадому рапсавы алей. Праўда, калі ў краму ходзіць жонка, яна па-ранейшаму выбірае сланечнікавы, — падзяліўся Іван Іванавіч. — У нас да рапсавага алею пакуль не прывыклі, а вось у Германіі, напрыклад, яму аддаюць перавагу перад аліўкавым і лічаць прадуктам здаровага харчавання.

Сапраўды, у еўрапейскіх краінах, высокаразвітых краінах Азіі і ў ЗША рапсавы алей лічыцца суперфудам — прадуктам, які валодае адмысловымі карыснымі ўласцівасцямі. А ў Беларусі з прычыны кліматычных умоў з усіх алейных культур лепш за ўсё расце менавіта рапс. Дарэчы, Беларусь экспартуе большую частку рапсавага алею. Геаграфія — Кітай, Ізраіль, краіны ЕС.

## Што ў ім добрага?

Прадукт атрымліваюць з насення расліны сямейства капусных з ярка-жоўтымі кветкамі.

— На сёння разам са сланечнікавым рапсавы алей з'яўляецца адным з найбольш спажываных у свеце раслінных алеяў, — распавядае **намеснік дырэктара Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра НАН Беларусі па харчаванні Алена МАРГУНОВА.** — Ён характарызуецца збалансаваным спалучэннем насычаных, поліненасычаных і мананенасычаных тлустых кіслот, змяшчае вялікую колькасць вітаміну Е. Каштоўна тое, што гэты прадукт з'яўляецца крыніцай незаменных тлустых кіслот сямейства амега-6 (лінолевая кіслата) і амега-3 (ліналенавая кіслата), якія спрыяюць умацаванню сценак сасудаў і зніжэнню ўзроўню халестэрыну ў крыві. Характэрна, што ён змяшчае ў дзесяць разоў больш амега-3, чым аліўкавы.



Дарэчы, рапсавы алей у Еўропе і ЗША называюць «паўночным аліўкавым» або «рускім аліўкавым», паколькі па змесце алеінавай кіслаты ён не саступае аліўкаваму, адзначыла спецыяліст. Багатае ўтрыманне амега-3-6-9 поліненасычаных тлустых кіслот у лепшы бок адрознівае яго ад сланечнікавага, у якім іх значна менш ці ўвогуле няма. Тлустыя амега-кіслоты зніжаюць у крыві ўзровень шкоднага халестэрыну, нармалізуюць стан крывяноснай сістэмы, умацоўваюць сценкі сасудаў.

— Памяншэнне ўтрымання халестэрыну ў крыві спрыяе прадухіленню сардэчна-сасудзістых захворванняў, — падкрэслівае спецыяліст.

Ёсць у рапсавага алею і яшчэ адзін плюс: ён істотна паскарае метабалізм, спрыяючы зніжэнню вагі. Гэта ўласцівасць усіх прадуктаў з высокім утрыманнем амега-тлушчаў — яны эфектыўна ліквідуюць вастрыню пачуцця голаду. Бонус — паляпшэнне памяці і кагнітыўных функцый (што асабліва каштоўна для ўдарнікаў разумовай працы і людзей пасля 55—60 гадоў), рост прадукцыйнасці працы мозгу і моцныя косткі.

Пратаколы даследаванняў рапсавага алею паказваюць, што суадносіны амега-3 і амега-6 у ім аптымальныя для засваення арганізмам. Ідэальным дыетолагі лічаць баланс гэтых рэчываў у прапорцыі 1:4 і ніжэй. У рапсавым алеі гэта суадносіны 1:2. Для параўнання: у сланечнікавым — 0,1:199. Таму вытворцы брэндавых харчовых прадуктаў (у тым ліку для дзіцячага харчавання) у Еўропе сёння паўсюдна выкарыстоўваюць харчовы алей з рапсу, што не падвяргаўся геннай мадыфікацыі.

Што яшчэ дадаць да пераліку плюсаў? Вітаміны ў складзе: А аднаўляе зрок, В умацоўвае нервовую сістэму, F удзельнічае ў тлушчавым абмене, Е падтрымлівае імунітэт і не дае старэць.

— Рапсавы алей — крыніца такаферолаў (вітаміну Е), якія валодаюць антыаксідантнымі ўласцівасцямі і перашкаджаюць акісленню ліпідаў, — адзначае спецыяліст.

Гэта значыць, прадукт спрыяе захаванню маладосці скуры, моцы і росту валасоў. І, нарэшце, нельга пакінуць па-за ўвагай нізкі кошт прадукту ў параўнанні з аліўкавым.

## А як наконт крытыкі?

Адкуль ногі растуць у негатыўнага стаўлення да рапсавага алею? У гэтай культуры няпросты шлях да нашага стала! Многія стагоддзі рапс проста выпалвалі як пустазелле. Радзімай рапсу лічацца краіны Міжземнамор'я. З часам культура была завезена ў Англію. У Расійскую імперыю трапіла ў XIX стагоддзі, у СССР да 1960-х вырошчвалася як тэхнічная. Справа ў тым, што пры адцісканні алею са старых гатункаў рапсу ў прадукце высокім было ўтрыманне шкоднай для чалавека эрукавай кіслаты. Таму рапсавы алей ужывалі для вытворчасці мыла і выкарыстоўвалі ў тэкстыльнай галіне. Але ў 1961 годзе ў Канадзе быў выведзены гатунак рапсу «Канола», дзе гэты кампанент мінімальны. Сучасныя высокаўраджайныя гатункі, якія вырошчваюцца па ўсім свеце, даюць магчымасць атрымліваць рапсавы алей, дзе ўтрыманне эрукавай кіслаты — менш за 0,2 %. Дадайце сюды сучасныя тэхналогіі атрымання алею і сістэму кантролю якасці: утрыманне эрукавай кіслаты ў рапсавым алеі, які паступае ў харчовую прамысловасць і гандлёвую сетку, не павінна перавышаць 0,5 %. Так што небяспекі няма, а прадузятасць засталася. Зрэшты, паступова яна сыходзіць у мінулае, і новы для многіх прадукт знаходзіць належнае месца ў рацыёне.

— Рапсавы алей рэкамендуецца ўжываць у кулінарыі для запраўкі салатаў і выкарыстоўваць для гатавання страў, — распавядае Алена Міхайлаўна. — Ён не мае ярка выяўленага паху і смаку, затое можа максімальна падкрэсліць смак прадуктаў. Лепш за ўсё выкарыстоўваць яго для запраўкі агародніннных салатаў, а таксама для марынадаў, соусаў і хатніх маянэзаў, мясных, рыбных і крупяных страў.

Дарэчы, менавіта рапсавы алей ідэальны для гатавання страў у фрыцюры: кавалачкі атрымліваюцца залацістымі і апетытнымі, а сам алей не дыміць. Іншая справа, што гэты спосаб кулінарнай апрацоўкі наўрад ці можна назваць здаровым і карысным.

## Кухары кажуць...

А цяпер звернемся да практыкі. На што звярнуць увагу, выбіраючы рапсавы алей? У першую чаргу, як ні банальна гэта гучыць, не паленуйцеся прачытаць інфармацыю на этыкетцы. Перш за ўсё вас павінна зацікавіць утрыманне эрукавай кіслаты — у ідэале 0,3 % і не вышэй. Колер прадукту павінен быць светла-жоўты, а ў бутэльцы не павінна быць асадку. Захоўваюць рапсавы алей у шкле, а прадаюць часцей у пластыкавых бутэльках. Значыць, дома пераліце алей з бутэлькі ў банку і шчыльна закрыйце. Захоўвацъ прадукт рэкамендуецца ў цёмным, сухім, халаднаватым месцы і берагчы ад прамых сонечных прамянёў: ад сонца алей цямнее і губляе водар, а таксама вітамін Е, з-за якога прадукт лічыцца асабліва каштоўным.

Дыетолагі і фуд-блогеры раяць рапсавы алей з пазіцыі правільнага харчавання. Але што кажуць кухары?

— Я вельмі добра стаўлюся да рапсавага алею, — распавёў **Аляксандр ЧЫКІЛЕЎСКІ, кіраўнік Гільдыі кухараў і шэф-кухараў Беларусі.** — Прыкладна год таму я супрацоўнічаў з прадстаўнікамі кампаніі-вытворцы рапсавага алею, тады паспрабаваў гатаваць на ім і цяпер дома выкарыстоўваю толькі гэты алей. Ён таннейшы за аліўкавы і сланечнікавы, а па сваіх якасцях не горшы, і гатаваць на ім — задавальненне! А які на рапсавым алеі атрымліваецца хлеб! Вядома, калі казаць пра смак, усё заўсёды вельмі індывідуальна, але асабіста мне і смак, і кулінарныя ўласцівасці рапсавага алею вельмі спадабаліся.

І напрыканцы прапануем чытачам просты рэцэпт, які прыйдзецца па душы і гурманам, і прыхільнікам здаровага харчавання.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

### Французскі сметанковы суп

Нам спатрэбіцца цыбуля-парэй, бульба, 200 мл вяршкоў, філе чырвонай рыбы (напрыклад, ласось), базілік і прыправы — у арыгінале насенне фенхелю і мускат. І рапсавы алей, зразумела (20—25 мл), бо гэта ўсё пра яго.

Цыбулю-парэй мыем і досыць дробна рэжам, бульбу наразаем кубікамі. У рондалі разаграваем рапсавы алей і выкладваем у яго нарэзаную цыбулю і насенне фенхелю (зрэшты, без яго таксама смачна). Абсмажыўшы, дадаём 0,4 л вады і бульбу. Варым на маленькім агні паўгадзіны пасля закіпання і, злёгку астудзіўшы, узбіваем блэндарам суп да аднастайнасці, у працэсе ўліўшы ў яго слівкі і дадаўшы соль да мускатны арэх. Зноў ставім суп на агонь і кладзём у яго невялікія кавалачкі рыбы. Застаецца праз сем хвілін пасля закіпання ўсыпаць дробна нарэзаны базілік. Выключаем агонь, накрываем супчык і даём настаяцца.

Радзімазнаўства

## ВУСНАМІ СТАРАЖЫЛАЎ

**У верасні 2016 года мінская васьмікласніца Арына КЛІМОВІЧ вырашыла ўзяць удзел у гарадскім конкурсе даследаванняў з тэмай «Тапонімы». Дзядуля — Станіслаў Іванавіч КРЭПСКІ, які мае філалагічную адукацыю і зацікаўлены ў вывучэнні роднай Пухавіцкай старонкі, параіў дадаць да выключна тапанімічнага матэрыялу звесткі пра канкрэтную мясцовасць. «Трэба, — казаў ён, — каб мясціны загаманілі пра сябе вуснамі старых жыхароў...» Але пакуль рыхтавалася работа, «конкурс некуды знік». І ў выніку са школьнага даследавання ў 50 старонак вырасла кніга «Тапонімы роднага краю».**




І Арына, і яе дзядуля так захапіліся работай, што краязнаўства, вывучэнне гісторыі Пухавіч, куды яны штогод прыязджаюць летаваць, навакольных паселішчаў стала важным клопатам іх жыцця. І як вынік — новая кніга двух аўтараў: «Тапонімы роднага краю і побыт яго насельнікаў». Яна ўбачыла свет зусім нядаўна ў мінскім выдавецтве «Белпрынт». І цікаўныя да гісторыі чытачы маюць унікальную магчымасць ажыццявіць незвычайнае падарожжа ў адну з адметных мясцін Міншчыны.

Карыстаючыся ў асноўным народнай памяццю, звесткамі, атрыманымі ад старажылаў, аўтары ўзнаўляюць з розных стагоддзяў многія цікавінкі гісторыі мястэчка. Сапраўды ўражваюць лаканічныя сведчанні пра супольнае, міралюбівае жыццё ў Пухавічах прадстаўнікоў розных нацыянальнасцяў — беларусаў, яўрэяў, татараў, прадстаўнікоў розных канфесій — праваслаўных, каталікоў, іўдзеяў, мусульман... Гледзячы па ўсім, у кнігі Арыны Клімовіч, Станіслава Крэпскага «Тапонімы роднага краю і побыт яго насельнікаў» павінен быць працяг. І ўжо ў новым выданні мы сустрэнемся са многімі тымі, хто нарадзіўся ў Пухавічах і суседніх вёсках, хто спрычыніўся да гэтых мясцін. З Пухавіч — акадэмік Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, доктар медыцынскіх навук, прафесар Арнольд Смеяновіч; доктар палітычных навук, кандыдат філасофскіх навук Мікалай Лабуш; акцёр Купалаўскага тэатра Аляксандр Лабуш; пісьменнік і журналіст Аляксандр Шабалін; кандыдат медыцынскіх навук Уладзімір Сянчук; кандыдат сельскагаспадарчых навук Аляксандр Матох; мастак Аляксандр Дасужаў; паэтэса і журналістка Вольга Савасцюк; дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Марына Шкроб; чэмпіён свету па біятлоне сярод юніёраў Мікалай Правалоцкі і яшчэ шмат хто з людзей, якія сваімі справамі зрабілі і робяць шмат карыснага для нашай Айчыны.

**Раман СЭРВАЧ.**

# ЗБІРАЛЬНІК ЗАЛАТОГА ЗЕРНЯ СЛОЎ

## Да 75-годдзя з дня нараджэння Алеся Марціновіча

**«Хто мы, адкуль мы?» — толькі манкурт, які не памятае свайго роду-племені, не задаваў сабе гэтага пытання. Як не згадаць аднаго з герояў Піліпа Пестрака (раман «Сустрэнемся на барыкадах»). У яго пытаюць:**
**— Адкуль ты?**
**— З вёскі Пакуты.**
**— А дзе тая вёска?**
**— Дзе ў полі бярозка.**

Хочацца дадаць: яшчэ там, дзе нясе свае воды «чысцейшы ад чэрвеньскіх рос» бацька-Нёман, дзе дыямент сталіцы — горад-герой Мінск і закаваная ў бетон Свіслач, дзе колеру льняной квецені Браслаўскія азёры, дзе тысячагоддзі гамоніць Белавежская пушча, «дзе сцяжыначка кожная ў прыветлівы двор прывядзе». Адным словам, на Белай Русі.

Алесь Марціновіч — цудоўны крытык, без перабольшання: і па колькасці, і па якасці напісанага. Аднойчы Іван Навуменка на чарговым з'ездзе пісьменнікаў, быццам няўзнак, незласліва папракне Інстытут літаратуры пры Акадэміі навук: «Адзін Марціновіч рэцэнзуе кніг больш, чым увесь ваш штат супрацоўнікаў. Я ўжо не кажу пра высокую якасць рэцэнзій Алеся Андрэевіча».

Праўда (слова з песні не выкінеш), амаль усе рэцэнзіі станоўчыя. За гэта нядобразычліўцы і зайздроснікі нярэдка папракалі Алеся. Гэта ўсё роўна як папракаць Прыпяць, што павольна нясе свае воды, а Нёман і Шчару — за імклівы бег. Добрая душа шукае ў творах сваіх калег цікавінкі, а зласлівец, аглабельны крытык — парушынку ў чужым воку.

Вось за дабрыню, за няўяўную шчырасць сябры і паважаюць Марціновіча. Калі дзесяць гадоў таму пісьменніка вылучылі на Дзяржаўную прэмію Рэспублікі Беларусь, ніхто ні на ёту не сумняваўся, што Алесь «пройдзе». І не за крытыку атрымаў ганаровую ўзнагароду, а за кнігу з цыкла «Зерне да зерня», дзе нацыянальная гісторыя раскрываецца праз асобы знакамітых беларусаў. У беларускай, ды і ў сусветнай літаратуры не было выпадку, каб адзін аўтар прасачыў у дакументальна-мастацкіх творах лёс каля трохсот (!) знакамітых землякоў і тых, хто нарадзіўся ў іншых краінах, але звязаў свой лёс з нашым краем.

За няўрымслівасць, несумненны талент, за культ працы такога чалавека нельга не паважаць. І свой 75-гадовы юбілей выдатны крытык, празаік, нарысіст сустракае больш чым з сотняй арыгінальных кніг.

### АДКУЛЬ ЁН?

Алесь Марціновіч родам са Случчыны, апетай у паэме Якуба Коласа «Новая зямля». Бацька, Андрэй Рыгоравіч, і маці, Яўгенія Аляксандраўна, — вясковыя настаўнікі. Менавіта яны прывілі сыну глыбокую любоў да паэзіі, гісторыі Беларусі.

— Куды, сынок, паступацьмеш? — спытала неяк маці.

— На філфак Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, — не задумваючыся, адказаў Алесь.

— А можа, адразу на журфак?

— Туды бяруць толькі стажнікаў.

— Але ж ты друкаваўся ў раённай газеце, у «Піянерскай праўдзе»...

— Гэта не ў лік. Не прымуць нават дакументаў. З цягам часу (так робяць многія) перавядуся, калі пашанцуе, на факультэт журналістыкі.

Ні Яўгенія Аляксандраўна, ні Андрэй Рыгоравіч не сумняваліся, што іх Алесь паступіць. І па літаратуры, і па мовах у яго цвёрдыя пяцёркі. Так урэшце і здарылася.

Адвучыўшыся два гады на філфаку, Алесь канчаткова зразумеў, што настаўнікам быць не хоча. Хвалюючыся, падаўся да дэкана журфака Рыгора Васілевіча Булацкага.

Даволі высокі, шырокі ў плячах, з вачыма па яблыку і круглым, як шар, тварам, ён здаваўся непрыступным, суровым, і толькі зрэдку ўсё роўна дарыў усмешку.



— Нябось, хочаш перавесціся на журфак? — угадаў дэкан.

— Хачу, Рыгор Васілевіч.

— Навошта? Законча філфак, год-два папрацуй настаўнікам. Можа, спадабаецца?

— Не спадабаецца.

— Чаму? — здзівіўся Булацкі.

— Мае бацькі настаўнікі. Нагледзеўся на іх работу. Не атрымаецца быць прадаўжальнікам настаўніцкай дынастыі.

— Пішаш?

— Пішу.

— Дзе друкаваўся?

— У газеце «Літаратура і мастацтва», у «Звяздзе», «Мінскай праўдзе»...

— Хопіць. Спытаў я для прыліку. Тое-сёе з тваіх замалёвак чытаў. Пішы заяву на перавод.

— Вялікі дзякуй.

— Скажаш дзякуй, калі зможаш здаць экзамены і залікі. А іх мех пад завязку.

— Дазадам, Рыгор Васілевіч!

Праз шмат гадоў Алесь Марціновіч напіша дакументальна-мастацкую аповесць пра Булацкага. Раскажа, як той у вайну гарэў у падбітым самалёце, як прадаў гармонік, адшкадаваў усе свае грашовыя зберажэнні і разам з сябрамі «купіў» самалёт. Як зрэнку вока, Рыгор Васілевіч бярог тэлеграму Сталіна, у якой правадыр усіх часоў і народаў выказваў падзяку за патрыятычны ўчынак. Праўда, шануючы памяць дэкана, ні слова не напісаў, як тая тэлеграма памагала падымацца па кар'ернай лесвіцы. Але гэта ўжо зусім іншая гісторыя.

Філфак, журфак БДУ, работа ў раённых газетах і 30 (!) гадоў у штотыднёвіку «Літаратура і мастацтва», дзе па-сапраўднаму раскрыўся талент Марціновіча-крытыка, публіцыста, празаіка. Да Алеся паважна ставіліся Іван Мележ, Іван Чыгрынаў, Іван Шамякін, Васіль Быкаў — зрэшты, як і маладыя пісьменнікі, якіх Марціновіч заўсёды падтрымліваў.

Дзясяткі аб'ёмных кніг, карпатлівая штодзённая работа над шматтомнай гісторыяй Беларусі ў асобах. Адзін з апошніх твораў, «Зерне да зерня», сабраў найлепшыя творы цыкла «Постаці», «разлічаныя на ўсіх, хто неабыякавы да гісторыі сваёй радзімы». Настаўнікі з поспехам выкарыстоўваюць яе ў пазакласнай і школьнай рабоце.

### МІЛЫЯ ВОБРАЗЫ РОДНАГА КРАЮ

Прыемна, што тытанічная праца Алеся Марціновіча атрымала прызнанне. Ён лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь, заслужаны дзеяч культуры, узнагароджаны прэміямі імя Максіма Багдановіча і Уладзіміра Калесніка, прэміямі «Залаты Купідон», прэміяй БСЖ «Залатое пяро», адзіны ў краіне двойчы «Заслужаны журналіст» Саюза журналістаў. Узнагароджаны медалём Францыска Скарыны.

Адзін пералік гістарычных герояў Алеся Марціновіча заняў бы дзясяткі старонак. Зярно да зярняці збіраў пісьменнік. Тры сотні рамантызаваных біяграфій. Дзясяткі адкрыццяў, невядомых чытачам фактаў з жыцця Рагнеды, Усяслава Чарадзея, Ефрасінні Полацкай, Кірылы Тураўскага, Міколы Гусоўскага, Льва Сапегі, Васіля Вашчылы, Міхаіла Клеафаса Агінскага, Ігната Дамейкі, Станіслава Манюшкі, Уладзіслава Галубка... Гэта тысячы дзён працы ў бібліятэках, архівах, шчыраванне днём і ноччу за пішучай машынкай, а зараз на камп'ютары.

У эсэ «Песня пра Беларусь» Алесь Марціновіч надзвычай цікава распавядае пра слыннага нашага земляка Міколу Гусоўскага, якому папа Леў X даручыў напісаць паэму пра паляванне на зубра. Паўстае з небыцця (эсэ «Дзень абяцаў быць цудоўным») постаць драматурга, рэжысёра, акцёра, першага народнага артыста Беларусі Уладзіслава Галубка і яго «галубнят» з перасоўнага тэатра, які на фурманках калясіў па Беларусі, далучаючы народ да мастацтва. І ў тым тэатры — скрыпач Міхась Лучанок (бацька Ігара Лучанка), цымбаліст Алесь Ліпніцкі, саліст Андрэй Блажэвіч...

Чытаеш пра Галубка, і слёзы наварочваюцца на вочы. Трагічна загінуў бацька, і пачалися ў дванаццацігадовага хлапчука «жыццёвыя «ўніверсітэты». Грузчык, слесар чыгуначнага дэпо. Нязгасная прага да прыгожага. «Самавукам» навучыўся іграць на барытоне, трамбоне, баяне, а там — і маляваць, захапіўся літаратурай.

Праз снежную замець, пад воўчае завыванне цягнуліся падводы з людзьмі і рэквізітам. За шэсць гадоў — паўтары тысячы спектакляў! Народнае прызнанне і арышт у страшным трыццаць сёмым. Смерць 7 ліпеня 1942 года. Пра што ён думаў, што згадваў?

*«Рассунуліся пасцілкі і... Быццам дыхнула на гледачоў чымсьці сваім, знаёмым з маленства. Як бы не ў пуні знаходзішся, а дзенебудзь на ўлонні прыроды. На заднім плане бачыцца разложысты луг, далей — дрэвы. Віднеюцца хаты. Тут жа поруч, самы што ні ёсць пакой, а ў ім простая вясковая дзяўчынка. Васемнаццацігадовая парабчанка Ганка. Жаліцца, праклінае долю сваю: «Так, вось і паненку панічу сватаюць багатую, вучоную дваранку. Не зайздрошчу, а радуюся шчасцю другіх людзей...»*

Апошнія словы ключавыя. Алесь Марціновіч заўсёды радуецца поспехам сяброў па пяры, нават пачаткоўца не зачэпіць, далікатна падкажа, як зрабіць твор ямчэйшым, дзе трэба дапісаць, што скараціць, а можа, на нейкі час памаўчаць, бо «чым даўжэй маўчанне, тым дзіўней слова».

У кнігах Алеся, як мне здаецца, амаль няма нецікавых твораў. І паўстаюць перад намі постаці нашых вялікіх продкаў, ажываюць забытыя і паўзабытыя імёны. Вядзе ў атаку сваіх салдат генерал Гурка, піша свой знакаміты на ўвесь свет паланэз Міхаіл Агінскі, становіцца нацыянальным героем Чылі беларус Ігнат Дамейка... Яны пакінулі свой след на зямлі, як пакідае і ён, Алесь Марціновіч. І гэты след сапраўды глыбокі!

**Васіль ШЫРКО.**





# ДЗЕ МЁД, ТАМ І СВЯТА!








*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Храм гэты (хоць будынак афіцыйна і называюць капліцай) узведзены ў садаводчым таварыстве «Крап» у Смалявіцкім раёне і належыць грамадскаму аб'яднанню «Мінская гарадская казацкая акруга». Капліца названа ў гонар аднаго са святых альбо праведнікаў — Прападобнамучаніка Вадзіма Пярсіцкага. Дзесяць гадоў таму, калі закладвалі падмурак, першы беларускі мітрапаліт Філарэт вызначыў імя святога патрона казацкай святыні.

— Капліцу будавалі талакой, сваімі рукамі казакі ўзводзілі сцены, крылі дах, вешалі званы на званіцу, масцілі дарогу і прыступкі, — падзяліўся прыемнымі ўспамінамі **казачы атаман Генадзь ЖУМЯНОК.** — Мядовы Спас склікаў нашу суполку, лічы, казацкі прыход, каб у царкоўнай атмасферы адзначыць першы юбілей капліцы і дваццаціпяцігоддзе ўтварэння Мінскай казацкай акругі.

На святочнае богаслужэнне прыйшлі і іншыя дачнікі. Службай правіў протаіерэй Андрэй Еўдакімаў — настаяцель храма архангела Міхаіла ў горадзе Жодзіна, кіраўнік Барысаўскага епархіяльнага аддзялення па сувязях з казацтвам. Святар акрапіў мёд, які сабраў на сваёй пасецы і раздаваў усім прысутным казак-пчаляр Валерый Жураўскі. Атаман уручаў памятныя юбілейныя медалі актыўным казакам, сярод якіх быў Вацлаў Селіцкі — арганізатар і куратар будоўлі капліцы, цяперашні яе захавальнік, а таксама казачка Ірына Захаранка.

Свята прайшло пад ігру новенькіх званоў умелага званара — харунжага Віктара Церахава.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

*Больш здымкаў з гэтай падзеі глядзіце на сайце «Звязды».*

Центр Промышленной Оценки
• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703** |
| **Продавец** | **ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, пр-т Машерова, 29** |
| **Оператор ЭТП** | **ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б. www.ipmtorgi.by** |
| **Предмет электронного аукциона – капитальное строение, расположенное по адресу: Гродненская обл., г. Лида, ул. Комсомольская, д. 26В** | |
| **Магазин № 16** (здание специализированное розничной торговли) общей площадью 187,7 кв. м, инв. номер 420/С-5930. Составные части и принадлежности: ворота (а), дворов покрытие (б). **Обременение:** аренда | **Начальная цена с НДС 20 % – 191 093,69 бел. руб.** |
| **Сведения о земельном участке с кадастровым номером 441300000007000277:** предоставлен на праве постоянного пользования для размещения объектов розничной торговли общей площадью 0,0326 га | |
| **Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки» | |
| **Срок заключения договора купли-продажи: 10 рабочих** дней после проведения электронных торгов | |
| **Условия оплаты предмета электронных торгов:** победитель электронных торгов или единственный участник электронных торгов, согласившийся приобрести предмет электронных торгов по начальной цене, увеличенной на 5 % (далее – единственный участник электронных торгов), обязан произвести оплату в размере 100 % стоимости имущества не позднее **10 рабочих дней** с момента заключения договора купли-продажи | |
| **Порядок проведения и оформления участия в электронных торгах** | |
